Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАУЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАУ БССР І УПРАУЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАУ ПРЫ СНК БССР

№ 34 (448) | Аўторак, 3 кастрычніка 1939 года | Цана 20 кап.

СССР БЫЎ, ЁСЦЬ І АСТАНЕЦЦА АПЛОТАМ МІРУ І ДРУЖБЫ ПАМІЖ НАРОДАМІ ЎСЯГО ЗЯМНАГА ШАРА («ПРАВДА»)

РАСЦЕ І КВІТНЕЕ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

Краем жабрацтва, культурнай адсталасці і невуцтва была да Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі наша Беларусь. «Між топкіх багнішчаў, на выдмах пясчаных», цярпячы нацыянальны і соцыяльны прыгнёт, гібелі беларускія сяляне на вузкіх палосках неўраджайнай зямлі. Ад цямна да цямна працавалі рабочыя на фабрыкантаў і заводчыкаў, а самі жылі ў недаедзе і цемры, у вялікай нястачы. Загнаныя, прышыбленыя пагромамі, сціснутыя ў так званай мяжы аседласці пакутавалі працоўныя яўрэі.

Літаратура, мастацтва, культура беларускага народа былі загнаны царызмам у глыбокае падполле. Кожнае жывое, свабоднае слова каралася гадамі катаргі і ссылкі, турэмнай няволяй.

У такіх умовах жылі і працавалі да рэвалюцыі лепшыя сыны народа, яго песняры Янка Купала, Якуб Колас, Змітрок Бядуля.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя вызваліла наш народ ад галечы, дзікунства, прыгнёту, соцыялізм прынёс працоўным горада і вёскі шчаслівае і раднаснае жыццё. Але ў няволі, пад прыгнётам польскіх паноў засталася частка нашых крэўных братоў-беларусаў, для якіх была польская дзяржава была той-жа турмой народаў, як і царская Расія. У той час, як народы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, падупаўшыя пад уладу сваіх адвечных ворагаў—польскіх паноў, гібелі ў няволі, цярпелі прыгнёт і насілле, у Совецкай Беларусі нястрымна і бурна ўзнімаўся дабрабыт працоўных, расла культура, мастацтва, літаратура, выхоўваліся ўсё новыя і новыя атрады інтэлігенцыі з рабочых і сялян.

Дарэвалюцыйная творчасць Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі была прасякнута сумам. Іх песні жывіліся гневам, нянавісцю народа да ўсіх тых, што «у ланцугі ўсё закавалі — і суд, і праўду і закон», да тых, хто ўзваліў на плечы працоўнага чалавека торбу, паставіў яго перад вечнай перспектывай папасці ў турму, прымусіў яго у шынку шукаць уцехі і збавення ад гора. За годы совецкай улады беларуская літаратура непазнавальна вырасла, змяніла тэматыку, выхавала новыя таленавітыя кадры. Народныя паэты рэспублікі ордэнаносцы Янка Купала і Якуб Колас у перамогах соцыялізма ўбачылі здзяйсненне сваёй мары аб свабоднай і шчаслівай Беларусі. Яны пяюць цудоўныя песні аб калгасах і соўгасах, пабудаваных на непраходных раней балотах, аб новай вёсцы і яе людзях. Увесь народ ведае паэму Купалы «Над ракой Арэсай», далёка за межамі Беларусі спяваюць песні Купалы, прысвечаныя вялікаму Сталіну, радзіме, Чырвонай Арміі, лётчыкам. Дзесяткі глыбока-лірычных, прачутых, дзіўных па свайму майстэрству песень стварыў за гэты час Якуб Колас. Яго пяру належыць патрыятычная ў лепшым сэнсе гэтага слова аповесць «Дрыгва» пра барацьбу нашага народа з белапольскімі акупантамі. Выдатны пісьменнік ордэнаносец Змітрок Бядуля па трапнаму выразу Якуба Коласа «прышоў у фокус нашых дзён» праз свае выдатныя аповесці «Салавей» і «Набліжэнне».

У аповесці «Салавей» Змітрок Бядуля ярка і праўдзіва паказвае, як здзекаваліся паны над народам і яго талентамі. У аповесці «Набліжэнне» пісьменнік намаляваў карціну няўхільнага росту рэвалюцыйнай свядомасці ў асяроддзі местачковай інтэлігенцыі напярэдадні імперыялістычнай вайны 1914 года. У вобразе пана Вашамірскага і яго маці нашы вызваленыя заходнія браты лёгка пазнаюць сваіх нядаўніх прыгнятальнікаў, у вобразах сялян, выведзеных Бядуляй у «Салаўі» пазнаюць нашы браты саміх сябе. А для нас, для Совецкай Беларусі гэта далёкае мінулае.

У беларускую літаратуру за годы совецкай улады прышлі з самых глыбінь народа новыя таленавітыя майстры слова Міхась Лынькоў, Эдуард Самуйлёнак, Кузьма Чорны, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка, Аркадзь Куляшоў і многія іншыя пісьменнікі і паэты. Усе яны вышлі з народа і пішуць для народа. творчасць кожнага з іх вызначаецца новай тэматыкай, прынесенай у літаратуру перамогай рэвалюцыі.

Наша літаратура паспяхова перамагае нацыянальную абмежаванасць, якая была для яе характэрна яшчэ не так даўно. Беларускі пісьменнік Эдуард Самуйлёнак стварыў раман «Будучыня» пра барацьбу грузінскага народа супроць здрадніцкага ўрада меншавікоў. Пісьменнік Змітрок Бядуля піша вялікі твор пра Іспанію. Паэт Пятро Глебка нядаўна закончыў п'есу «Над ракой Бярозай», у якой выведзен вобраз геpаічнага саратніка Сталіна, пролетарскага палкаводца Серго Орджанікідзе. У гэтым творы паказана барацьба таварыша Орджанікідзе за вызваленне беларускага народа ад белапольскіх акупантаў. Усё гэта факты няўхільнага росту беларускай літаратуры і пашырэння яе тэматыкі, факты ідэйнага і творчага росту нашых пісьменніцкіх кадраў.

Барацьба за перамаганне нацыянальнай абмежаванасці вывела беларускую літаратуру на ўсесаюзную арэну і заслужыла ёй пачэснае месца ў шэрагу літаратур брацкіх народаў.

У гэтыя дні, калі Чырвоная Армія вызваліла нашых братоў-беларусаў, якія пакутавалі ў былой польскай дзяржаве, беларускія пісьменнікі разам з усім народам перажываюць вялікі ўздым, вялікае свята. Злучэнне двух прымусова разлучаных частак Беларусі ў адно цэлае будзе новым стымулам для вялікага росту літаратуры, мастацтва, культуры беларускага народа. Беларуская літаратура знаходзіцца напярэдадні новага вялікага ўздыму.

ЯКУБ КОЛАС

Свайму народу

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою;
Сотні новых і ясных дарог
Расцілае жыццё прад табою.

Новай долі ўзыходзіць зара,
Будзеш жыць ты без панскай апекі:
Адышла, адцвіла іх пара,
І панам не вярнуцца ва векі.

Паглядзі, як прастэрна вакруг,
Як прыціхлі палацы, касцёлы.
Тваё ўсё: гэта поле і луг,
А ў палацах будуй сабе школы.

Ідзі-ж смела і чэсна ўпярод
Разам з намі дарогай адзінай:
Мудры Сталін вядзе свой народ
Самай вернай і простай пуцінай.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою:
Многа нэвых, шчаслівых дарог
Расцілае жыццё прад табою.

----o----

ДУХ ЗАХВАТВАЕ АД РАДАСЦІ

(З пісьма)

Шлю табе прывітанне з горада Ліда, дзе мы часова прыпыніліся. Гэта адзін з гарадоў Заходняй Беларусі, якую вызваліла наша слаўная Чырвоная Армія з-пад прыгнёту паноў-памешчыкаў і капіталістаў. А як часта мы з табой аб гэтым марылі і гаварылі з хлапцамі!... Мары нашы здзейсніліся раней нават, чым мы маглі спадзявацца. Цяпер увесь беларускі і украінскі народы, не падзеленыя ніякімі межамі, будуць жыць у сям'і брацкіх народаў Совецкага Саюза.

Настрой у мяне самы найлепшы, як і ва ўсёй нашай арміі. Проста дух захватвае ад такой радасці, ад такіх грандыёзных падзей. Падумай толькі, гэта-ж праўды, Дзяржаўны тэатр зможа выехаць на гастролі, скажам, хоць-бы ў Вільна і паказаць там «Партызаны». Раней мы гаварылі аб гэтым, як аб далёкім будучым.

Сяляне і рабочыя Заходняй Беларусі вельмі рады нашаму прыходу. Яны нам актыўна дапамагаюць і ахвотна расказваюць, дзе хаваюцца польскія банды. Затое панам, фабрыкантам, польскім афіцэрам наш прыход вельмі не да смаку. Гэта нашы заядлыя ворагі. Чырвоная Армія выпорвае іх з усіх нор, дзе яны пахаваліся.

Прывітанне ўсім.

КАНДРАТ КРАПІВА.

----o----

РАБОТНІКІ МАСТАЦТВА Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

На другі-ж дзень пасля выступлення Чырвонай Арміі для вызвалення братоў-беларусаў і братоў-украінцаў ад прыгнечання белапольскіх паноў, работнікі мастацтваў сталіцы БССР звярнуліся з просьбай да члена Ваеннага Совета Беларускага фронта тав. Панамарэнка даць ім магчымасць прадэманстрыраваць дасягненні беларускага мастацтва перад працоўнымі Заходняй Беларусі.

Просьба работнікаў мастацтва была задаволена. Зараз у Заходняй Беларусі выступаюць з канцэртамі ансамбль песні і пляскі Беларускай дзяржаўнай філармоніі, група артыстаў тэатра Оперы і балета і Белдзяржтэатра, брыгада артыстаў эстрады, чырвонаармейскі ансамбль песні і пляскі і інш. 28 верасня ў Заходнюю Беларусь выехаў аркестр беларускіх народных інструментаў Дзяржаўнай філармоніі БССР у складзе 34 чалавек.

Працоўныя гарадоў і вёсак Заходняй Беларусі сустракаюць работнікаў мастацтваў БССР з велізарным энтузіязмам і радасцю. Нарэшце, мара іх здзейснена. Тое, што яны часам слухалі па радыё нелегальна, хаваючыся ад злога вока польскіх жандараў і дэфензівы, зараз разгарнулася перад імі ва ўсёй сваёй прыгожасці.

Першы свой канцэрт ансамбль песні і пляскі Дзяржаўнай філармоніі даў 23 верасня ў Валкавыску. Яшчэ задоўга да пачатку канцэрта памяшканне кінотэатра было перапоўнена да адказу. Жадаючых папасці на канцэрт было ў дзесяць разоў больш. Артыстаў сустрэлі бурнай авацыяй. А калі артысты закончылі сваё выступленне, уся зала, стоячы, бурна апладыравала ў гонар братняй дружбы народаў, у гонар арганізатара ўсіх нашых перамог вялікага Сталіна. Доўга не пакідалі гледачы памяшканне кінотэатра. Яны асаджалі артыстаў пытаннямі, паціскалі ім рукі, дзякавалі за выступленне.

Чырвонаармейскі ансамбль песні і пляскі пад кіраўніцтвам тав. Ісакова 28 верасня выступаў у Лідзе. Поспех яго быў надзвычайны. Гледачы наладзілі ансамблю бурную авацыю і прасілі паўтарыць свой канцэрт яшчэ некалькі разоў.

----o----

СОВЕЦКІЯ КІНОФІЛЬМЫ Ў ВЫЗВАЛЕНЫХ ГАРАДАХ

Беларускае аддзяленне Саюзкінопракат паслала для дэманстрыравання ў гарады і вёскі Заходняй Беларусі 36 мастацкіх гукавых кінофільмаў, у тым ліку фільмы «Ленін у 1918 годзе», «Чалавек з ружжом», «Чапаеў», «11 ліпеня», «Мы з Кранштадта», «Вогненныя годы» і інш.

Працоўныя Заходняй Беларусі сустракаюць совецкія фільмы з вялікім захапленнем. У Дзісне першым пачаў дэманстрыравацца фільм «Ленін у 1918 годзе». Кінотэатр перапоўнен гледачамі. Пры паяўленні на экране Леніна і Сталіна раздаюцца воклічы: «Няхай жыве партыя большэвікоў!», «Няхай жыве вялікі Сталін!»

23 верасня ў Вільна совецкія кінофільмы пачалі дэманстрыравацца ў 12 кінотэатрах. Працоўныя Вільна ўбачаць такія выдатныя фільмы, як «Ленін у 1918 годзе», «Чапаеў», «Трактарысты» і інш.

----o----

КНІГІ ДЛЯ ПРАЦОЎНЫХ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Ва ўсіх гарадах і вёсках Заходняй Беларусі, вызваленых гераічнай Чырвонай Арміяй ад прыгнёту польскіх паноў, назіраецца велізарная цяга да совецкай літаратуры, да совецкага друкаванага слова. Наркамасветы БССР вызначыў рад мерапрыемстваў для забеспячэння насельніцтва Заходняй Беларусі кнігамі.

Бібліятэчны калектар Наркамасветы БССР укамплектаваў для пасылкі ў Заходнюю Беларусь першыя 20 бібліятэчак коштам звыш 10.000 рублёў. У кожную бібліятэчку ўвайшлі Канстытуцыі СССР і БССР, «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» на рускай, беларускай, яўрэйскай і польскай мовах, «Пытанні ленінізма» І. В. Сталіна, «Выбраныя творы» Карла Маркса, «Што дала совецкая ўлада працоўным» М. І. Калініна і інш.

У бібліятэчкі ўключана таксама многа мастацкай літаратуры —творы Горкага, Пушкіна, Лермантава, Шэўчэнка, народных паэтаў БССР Янкі Купалы і Якуба Коласа, рада яўрэйскіх пісьменнікаў. Уключаны нядаўна выданая кніга «Жыццё на ільдзіне» Папаніна, серыя кніжак «Бібліятэчка стаханаўскага вопыту» — экспанентаў Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі і інш.

Да камплектавання бібліятэчак-перасовак для Заходняй Беларусі прыступілі і мінскія гарадскія бібліятэкі. Рад перасовак укамплектавала дзяржаўная бібліятэка імя Леніна. У перасоўкі ўвайшлі матэрыялы XVIII з'езда ВКП(б), IV Сесіі Вярхоўнага Совета СССР, творы Леніна, кнігі «Сталін аб Леніне», «Ленін і Сталін аб Чырвонай Арміі», а з мастацкай літаратуры творы Купалы, Коласа, Бядулі, Крапівы, Лынькова, Броўкі, Глебкі, Чорнага і інш. беларускіх пісьменнікаў.

Уключаны таксама такія выдатныя творы, як «Хлеб» А. Талстога, «Паднятая цаліна» і «Ціхі Дон» Шолахава, «Як гартавалася сталь» Н. Астроўскага, творы Максіма Горкага і інш.

Па ініцыятыве вучняў і педагогаў 4 мінскай школы ва ўсіх школах сталіцы БССР пачаўся збор падарункаў для дзяцей працоўных Заходняй Беларусі. Пераважную большасць падарункаў складаюць кнігі, падручнікі, школьныя прылады.



Па гарадах і вёсках Заходняй Беларусі. На здымку: жыхары м. Смаргонь упрыгожваюць вуліцы лозунгамі.
Фота ТАСС.



Пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі

(З прамовы т. З. Бядулі на сходзе інтэлігенцыі г. Мінска)

Вялікі совецкі народ пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі творыць цуды на кожным кроку, ва ўсіх галінах нашага шматграннага жыцця.

Возьмем хаця-б параўнаўча невялікі адрэзак ад гістарычнага XVIII з'езда партыі да апошніх дзён.

На сусветнай выстаўцы ў Нью-Ёрку совецкі павільён карыстаецца сярод наведвальнікаў найвялікшым поспехам. Амерыканскія рабочыя і інтэлігенцыя захоплены гаспадаркай, тэхнікай, культурай, заможнасцю магутнага Совецкага Саюза. Працоўныя Амерыкі называюць наш павільён мадэллю новага соцыялістычнага свету, шчаслівай будучыняй чалавецтва. Наша жыццё з'яўляецца для іх толькі марай.

Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка ў Маскве натхняе не толькі нас, але дзівіць увесь свет.

Каго з нас не натхняе і не захапляе энтузіязм узбекскага народа, які стварыў за вельмі кароткі час грандыёзны Ферганскі канал працяжэннем у 270 кіламетраў! У гэтай гераічнай працы прымаў удзел увесь узбекскі народ — калгаснікі, рабочыя, інтэлігенцыя, песняры, музыканты, артысты, народныя сказальнікі.

Праца ўсяго народа ў Ферганскай даліне — гэта жывы гераічны эпас узбекскага народа нашых дзён, гэта натхнёны паэтычны воблік казачнай творчасці народа ў светлую эпоху Сталіна.

Дружба народаў дасягае ў нас незвычайных памераў. Яна авеяна сардэчнасцю, шчырасцю і глыбінёй, харастом і натхненнем. Святкаванне ў гэтым годзе ўсімі народамі Саюза юбілеяў Шэўчэнка, Шолам-Алэйхема, Салтыкова-Шчадрына і цяпер тысячагоддзя вялікага эпаса армянскага народа «Давід Сасунскі» — гэта светлыя маякі ў культурным жыцці шчаслівых народаў.

Нядаўна наша доблесная Чырвоная Армія дапамагла мангольскаму народу адкінуць ад граніц Мангольскай Народнай Рэспублікі нахабную, драпежную самурайскую зграю, якая раптоўна напала на чужую зямлю.

Таварышы! Дваццаць год, як мы, усе народы Совецкага Саюза, пад мудрым кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна—Сталіна, пад пяшчотным доглядам любімага Сталіна — будуем нашу шчаслівую радзіму. Дваццаць год, як мы па гранітнай лесвіцы ўзбіраемся ўсё вышэй і вышэй да сонца комунізма, да найвялікшага чалавечага шчасця. Дваццаць год мы ўсе — і рабочыя, і калгаснікі, і совецкая інтэлігенцыя—з'яўляемся творцамі шчасця і радасці.

А ў той-жа час з Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны да нас даходзілі плач і стогны, скаргі і мольбы аб выратаванні прыгнечаных, закатаваных панскім бізуном, нашых родных братоў — беларусаў, украінцаў і яўрэяў.

Ад польскага лютага пана, ад яго эпсоў-жандараў і асаднікаў нашы браты па крыві і класу цярпелі нечалавечыя здзекі. У іх было аднята ўсё — і маёмасць, і нацыянальная культура, і чалавечая годнасць. Нашы крэўныя браты цярпелі галечу і прыніжэнне чалавечай дастойнасці. Адзічэлая, пыхлівая, дурная і агідная шляхта купалася ў народнай крыві.

Усе дваццаць год мы дзень у дзень успаміналі аб жудаснай трагедыі нашых братоў у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне. Кожны з нас марыў аб іх вызваленні. Кожны з нас быў упэўнены ў гэтым.

Мары здзейсніліся!

Воляю Совецкага ўрада, воляю народа, воляю вялікага Сталіна наша гераічная, магутная і доблесная Чырвоная Армія вызваліла з дзікага панскага гнёту народы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны! На векі-вечныя вырваны прымежныя слупы, што адддзялялі братоў ад братоў, сясцёр ад сясцёр, бацькоў ад сыноў і родных ад родных.

Вызвалены народ з лікаваннем сустракае Чырвоную Армію, абнімае і цалуе камандзіраў і байцоў, засцілае іх шляхі кветкамі.

Па сёлах, мястэчках і гарадах вызвалены, шчаслівы народ з любоўю, сардэчнасцю і захапленнем называе Сталіна родным і любімым бацькам!

Над вызваленымі абшарамі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны палыхаюць чырвоныя сцягі.

Польскаму лютаму пану надышоў канец. Ён ужо ніколі не вернецца на нашыя землі — ніколі. Драпежны польскі арол зламаў свае крыллі і загінуў. Навекі вызвалены народ будзе аб ім успамінаць з агідай і праклёнамі.

Таварышы! Наша сіла, наша магутнасць расце з кожным днём. Гэта прызнаюць і нашы ворагі. Наша сіла — у інтэрнацыянальным адзінстве ўсіх брацкіх народаў Совецкага Саюза. Наша сіла ў шчыльным згуртаванні совецкага народа вакол вялікай партыі Леніна—Сталіна, вакол любімага правадыра і друга прыгнечаных усяго свету — Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Перад намі, совецкай інтэлігенцыяй, разгортваюцца цяпер новыя гарызонты творчай працы. Будзем працаваць не пакладаючы рук. Школы, газеты, больніцы, тэатры на вызваленых землях патрабуюць нашай дапамогі.

Перабудаванне на новыя рэйкі жыцця вызваленых братоў па крыві і класу патрабуе нашай дапамогі.

І мы, совецкая інтэлігенцыя, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна будзем працаваць аддана, з вялікім уздымам, з натхненнем, працаваць так, як байцы нашай роднай, магутнай, і слаўнай Чырвонай Арміі.

Таварышы! Пад сонечныя крыллі Сталінскай Канстытуцыі прышлі цяпер новыя мільёны вызваленых людзей з Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Нашу радасць не выкажаш ніякімі словамі. Пад яркім зззяннем гэтай вялікай радасці мы, совецкая інтэлігенцыя, павінны рыхтавацца да прадстаячых выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Кожны з нас павінен быць прадвыбарным агітатарам сярод шырокіх слаёў выбаршчыкаў. Кожны з нас павінен з вялікім уздымам рыхтаваць совецкі народ к выбарам.

Я ўпэўнен, што совецкая інтэлігенцыя, узнятая партыяй і народам на вялікую вышыню, з гонарам выканае гэту пачэсную работу.

Слава доблеснай Чырвонай Арміі!

Слава совецкаму народу!

Няхай жывуць вызваленыя Чырвонай Арміяй народы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны!

Слава геніяльнай партыі Леніна—Сталіна!

Слава правадыру і другу працоўных усяго свету — вялікаму Сталіну!

МІНСК—ВІЛЬНА

(З блак-нота)

Арлы на пагранічных слупах пры радкім святле хмурнай раніцы нахахліліся і мелі ўбогі выгляд. Танк, хіснуўшыся ў калдобіне, парваў дрот і пярэдняй часткай упоўз на тэрыторыю «Жэчы Паспалітай», — затым ірвануў наперад. За ім смела прайшлі дзесяткі танкаў.

Галаўны атрад кавалерыйскага палка, без гука, мякка ступаючы жалезам каваных капыт па расістай жоўтай траве, рушыў да ўзгорка за пагранічным слупам.

Кінуўшы вінтоўкі, удоўж лагчыны, да леса, уцякала група польскіх пагранічных салдат.

Дзве чаргі з кулямёта парушылі цішыню восенскай раніцы. Больш яны не паўтараліся — узвод польскіх салдат-рэзервістаў здаўся ў палон. На салдатах патрапаныя шынелі, на галавах выцвілыя «фуражыркі» — выгляд засмучаны, твары не разумеючыя. Гэта не воіны, а апранутыя ў старую, амаль непрыгодную для нашэння, ваенную вопратку сяляне. Яны паслухмяна склалі зброю. Ветлівым абыходжаннем камандзіраў Чырвонай Арміі і байцоў салдаты здзіўлены. Яны выказваюць жаль, што не затрымалі афіцэра, які камандаваў узводам.

Танкі і галаўныя эскадроны ідуць наперад. Спакой мірнага жыхара не парушан «грозным рэвам вайны» — вайны няма. Прышлі ўзброеныя браты па крыві, браты беларуса, які мучыўся ў панскім ярме, і прынеслі права на свабоду. Сяляне высыпалі на вуліцу, радаснымі ўсклікамі яны вітаюць байцоў. Твары ажыўленыя, на іх напісана радасць здзейсненай надзеі. Яны з прагнасцю бяруць у байцоў газеты, іх здзіўляе магутная тэхніка Чырвонай Арміі. Група сялян-беднякоў збіраецца ісці для «перамовы» з памешчыкам, які яшчэ не паспеў уцячы.

Адзіночныя польскія салдаты, кідаючы вінтоўкі, адстаюць ад паходнага строю і бяруць напрамак да роднага дома.

Унтэр-афіцэр Гайшун сам ідзе насустрач кавалерыйскаму раз'езду. Ён махае белай хустачкай. На прывале ў размаво ры з камандзірамі Чырвонай Арміі ён кажа: «нашы паны-афіцэры замест службы п'яніствавалі, гулялі ў карты, прадстаўлялі адзін аднаго да ордэнаў і чыноў, няхай-жа зараз расплачваюцца; я кадравы капрал, але я не хачу ваяваць, перакананы ўшыся ў такой «боездольнасці» польскай арміі».

Развіваючы імклівы разбег, аснашчоныя сакрушальнай тэхнікай, часці Чырвонай Арміі ідуць, гатовыя прыняць бой.

Наступае вечар. Невялікі начны адпачынак.

Заўтра на Вільна!

Добрыя весткі аб чулых адносінах Чырвонай Арміі да насельніцтва разносяцца па ўсіх вёсках і мястэчках. Аб Чырвонай Арміі гавораць, як аб магутным войску з грознай тэхнікай, артылерыяй, супроць якой цяжка каму-небудзь устаяць. Насельніцтва адчувае пачатак новага, сапраўды свабоднага жыцця, і ў кожнай вёсцы, мястэчку, хутары адбываюцца радасныя спатканні часцей з насельніцтвам. Бягуць памешчыкі, чуючы грозны час расплаты за шматгадовае прыгнечанне народа.

У населеных пунктах узорны парадак. Усюды літаральна з першым паяўленнем дазораў Чырвонай Арміі арганізуюцца часовыя органы мясцовага самакіраўніцтва, не спыняецца работа па гаспадарцы.

Войска ўвесь час не прыпыняе свайго імклівага марша.

Даёш Вільна!

Мястэчка Валожын, мястэчка Ольшаны. Усюды кіпіць жыццё. Чырвоныя сцягі. Не паспяваюць уступіць чырвоныя часці, як збіраецца мітынг, населеныя пункты агалашаюць воклічы радасці за прыход доўгачаканай свабоды.

Мясцовае насельніцтва ўказвае кватэры жандараў, паліцэйскіх, ворагаў народа, прыспешнікаў панскай улады.

Ад мястэчка Ольшаны па гор. Ошмяны некалькі рот палякаў пайшлі бокам ад дарогі, баючыся расправы мясцовага насельніцтва. На дарозе на поўным газу ў паніцы праскочылі паліцэйскія машыны. Ад пярэдніх танкаў іх аддзяляла адна гадзіна.

Совецкі танк грозны для ворага, але ён абаронца безабароннага насельніцтва. Пачуўшы рокат стальных машын, сяляне бягуць з усіх канцоў вёскі на дарогу.

Старому Антону Чмыру 70 год. Яго сына Юзэфа, былога чырвонага партызана, зніштожыла дэфензіва, малодшы сын Пётр схаваўся ў лесе ад прызыва ў панскую армію; старому Чмыру яшчэ сёння раніцой пагражаў рэвальверам жандар. Чмыр пачуў, што ідзе Чырвоная Армія; цяпер ён сам бачыць чырвоныя танкі братоў-вызваліцеляў, ён старым сэрцам, не заўсёды паслухмяным змучанаму целу, адчувае першыя мінуты доўгачаканай свабоды. Задыхаючыся ад глыбока напоўнішага яго шчасця, ён падае на зямлю і плача, як дзіцё. Палымнеючыся, ён зноў бяжыць, ногі сталі маладымі, сэрца б'ецца часта, часта: вось ён акружаны байцамі, але ён не можа вымавіць слова. Саскочыўшы з машыны чырвонаармеец паціскае старому руку і паказвае на партрэт таварыша Сталіна. Чмыр ведае, хто гэта. Гэта Сталін, гэта чалавек, які прынёс яму ў сёнешні дзень шчасце і радасць. Слёзы радасці зноў заліваюць маршчыністы твар старога і ён цалуе партрэт, крычыць ад радасці, якая перапоўніла яго ўсяго, ад радасці, якой не стрымаць. Ён доўга не мог гаварыць і калі пайшлі танкі і машыны, прыціскаючы партрэт дарагога чалавека да сэрца, ён з лёгкасцю маладога пабег да хаты.

---

9 гадзін вечара. Да раніцы чырвоныя войскі павінны заняць Вільна. Прадстаіць цяжкі начны марш.

Ошмяны пройдзены ў глыбокай поўначы. Дождж не спыняецца. Н-скі полк ідзе галаўным. Стары конармеец Масаленка бадзёра сядзіць на гарэзным кані і нават жартуе з побач едучым камандзірам. У галаве адна думка—«даёш Вільна!».

Вораг акапаўся на ўскраінах, пабудаваў барыкады; афіцэрскія і паліцэйскія групы занялі найбольш адказныя ўчасткі і аказваюць упартае супраціўленне.

У вуліцы ўварваліся нашы цяжкія танкі, адыходзяць паліцыя, адстрэльваючыся з-за куткоў, касцёлаў, падстрэшша. Жыхары схаваліся. Камандзіры Самакрутаў і Ламака ўпарта крок за крокам адкідаюць праціўніка, уводзячы часці Чырвонай Арміі ў вуліцы. Цокаючы каванымі капытамі, у горад урываліся нашы ліхія кавалерысты. Польскія ўланы, парадная войска імперыялістычнай-скарасьпелай дзяржавы, пакідалі коней, пяхота ўцякала. Тысячы салдат, сотні афіцэраў здаваліся ў палон.

Світала. Было 19 верасня. 5 гадзін раніцы. Вільна была канчаткова занята войскамі Чырвонай Арміі.

Новая свабодная раніца пачыналася па-дзелавому, у поўным парадку. На вуліцах сталі паяўляцца жыхары. Напужаныя начной стралянінай, убачыўшы ветліва ўсміхаючыхся чырвонаармейцаў і камандзіраў Чырвонай Арміі, яны прыходзілі ў сябе, з усмешкай сустракалі войскі і радасна іх віталі.

В. ГЛАЗЫРЫН.

Прывітанне пісьменнікам і паэтам Совецкай Беларусі

Ад імя заходне-беларускага батрацка-сялянскага літаратурнага маладняка вітаем вас, вольныя браты пісьменнікі і паэты Совецкай Беларусі.

Голас ваш у нашыя падзямеллі не даходзіў і мы былі кінуты на волю лёсу. Але мы не палі і вобмацкам ішлі наперад у барацьбе за жыццё і навуку. Мы не кончылі ніводнае школы, мы не мелі права друкавацца. Мы былі прыдушаны. Сягоння мы — вольныя і нам дарога шырокая. Сягоння ідзем далей, але не адны, а з усім совецкім народам.

Нашы песні ўліюцца у мора
На калгасных палях зазвіняць,
Іх сустрэнуць сірэны матораў
І паэмы совецкага дня.

Няхай жыве Совецкі Саюз!

Няхай жыве непераможная Чырвоная Армія, якая вызваліла нас ад белапольскага панскага іга!

Няхай жыве правадыр совецкага народа і ўсяго чалавецтва, дарагі і мудры настаўнік таварыш Сталін!

Сяргей ХМАРА.
Анатоль ІВЕРС.

Анатоль ІВЕРС

Вітаем музыку волі

Не зналі мы дня і не зналі мы ночы,
І вечна бізун рассякаў нашы плечы...
Дык годзі! У паходзе сялян і рабочых
Мы вольна сустрэлі і ранак і вечар.

Мы вышлі ўсе на спатканне прастораў,
Сцягі нашы глянь, як гараць і маячаць!
Не з здзекаў цяжкіх, не з вялікага гора,
А з радасці людзі смяюцца і плачуць.

То-ж вольныя будзем навекі з братамі
Чырвонае Арміі слаўных герояў!
І вёска ў горад стальнымі радамі
Раскідала радасць расспеваным роем.

І далей і глыбей машыны ўсё едуць,
Што скуты рукою совецкае сталі —
То нам Варашылаў прыносіць пабеду,
То нам — беларусам — дае яе Сталін!

ДЗЯКУЮ ШЧЫРА

З падзякай лажуся,
З падзякай ўстаю,
Бо сонца ўжо свеціць
У нашым краю.
Братоў-беларусаў,
Што ў Польшчы жылі,
Ледзь пан не замучыў,
Усю кроў папілі.

Народ быў зажаты
Панскай рукой,
Бралі ў салдаты
У адзежы сваёй.
Гінула многа
На фронце людзей,
Родна краіна
Стагнала ў бядзе.
Верасень месяц,
Семнаццаты дзень
Зняў з нас навекі
Смутак і цень.

Славамі не ў сілах
Мне апісаць,
Як нам цяпер міла
«Таварыш!» сказаць.
За гэтае слова
Нядаўна каралі,
За родную мову
Жандары збівалі.
Я дзякую сіле
Чырвоных байцоў
І Сталіна-бацьку,
Што ў пору прышоў.
Няхай яго імя
Цвіце на ўвесь свет.
Магуча краіна —
Саюзны Совет!

КРЭМКО Ніна,
сялянка вёскі Жуковы-Барок, Стаўбцоўскага павету, Заходняя Беларусь.



На гарадах і вёсках Заходняй Беларусі. **На здымку:** часці Чырвонай Арміі на вуліцах гор. Вільна. Фота ТАСС.

ВЫЗВАЛЕНАЕ СЛОВА

(Заметкі з дзённіка)

Калі мы пазнаёміліся і загаварылі пра вершы, пра новыя кнігі, выходзячыя ў Совецкай Беларусі, аб новых імёнах у совецкай літаратуры — паэт Сяргей Хмара, ён-жа намеснік начальніка рабочай гвардыі ў Слоніме, прапанаваў нам паказаць адну з «выдатнасцей» былой польскай дзяржавы. Высокі, хударлявы, пасівеўшы ад доўгага сядзення ў турмах, Сяргей Хмара не страціў бадзёрасці і, жартуючы, сказаў:

— Тое, што мы вам зараз пакажам, ёсць першая стадыя знаёмства з «умовамі» работы беларускіх пісьменнікаў у былой «Жэчы Паспалітай», а далей вам усё будзе зразумела і так.

Гутарка адбывалася ў велізарным белым будынку Слонімскага старостваа, які па сваёй архітэктуры нагадваў манастыр. Сяргей Хмара і яго сябра па літаратурнай рабоце, малады сялянскі хлапец Анатоль Іверс, правялі мяне ў склеп старостваа, дзе была абсталявана па апошняму слову дэфензіўнай «тэхнікі» камера катаванняў. Яе не абмінуў ні адзін з працоўных беларусаў, калі ён любіў свой народ, яго культуру, яго мову і гаварыў на гэтай мове. Жывое слова ў Заходняй Беларусі было на замку. Калі паліцыя даведвалася, што ў пэўнай вёсцы нехта пачаў пісаць на беларускай мове і нават адважыўся прачытаць свае вершы сярод сваіх таварышоў, над «вінаватым» навісала пагроза кары, турмы, ссылкі. Яго на дзень ці на два запрашалі ў камеру катаванняў «пагутарыць». Гэта было законам. Мы бачылі цёмныя склепы з доўгімі лаўкамі для прывязвання катуемых, бачылі вадзяныя цямніцы, дзе людзей трымалі па тры дні ў вадзе. Сэрца стыла ад усіх гэтых жахаў.

Ніякія камеры катаванняў, ніякія хітрыкі катаў не маглі зламаць сілы народнага слова. Хоць і ў падпольных умовах, але і тут развівалася беларуская літаратура, паяўляліся новыя імёны, хаця радка, але выходзілі тоненькія кніжачкі. З якім натхненнем сустракаў іх народ! Беднякі адной вёскі на працягу года збіралі 100 злотых, каб дапамагчы свайму земляку — маладому песняру Сяргею Хмары выдаць зборнічак вершаў «сваім коштам».

За месяцы два перад прыходам Чырвонай Арміі Сяргей Хмара задумаў стварыць групу пісьменнікаў бядняцка-батрацкага маладняка. У праграме групы было: праўдзівае асвятленне вялікіх поспехаў працоўных Совецкай Беларусі, барацьба з ненавісным польска-каталіцкім ігам. Група яшчэ толькі пачала афармляцца, а дэфензіва палічыла гэту арганізацыю звышкрамольнай. На паэтаў і пісьменнікаў пасыпаліся пакаранні. Сяргей Хмара, які толькі-што вышаў з турмы, трапіў у канцэнтрацыйны лагер, адкуль вышаў 17 верасня — у гістарычны дзень прыхода Чырвонай Арміі на тэрыторыю Заходняй Беларусі.

Так рукамі польскіх жандараў душылася жывое беларускае слова. Мастацкая падпольная літаратура Заходняй Беларусі не вельмі багатая, але яна несумненна з'яўляецца выдатнай каштоўнасцю і будзе з часам грунтоўна вывучана.

Сяргей Хмара прымае ўдзел у літаратуры каля 10 год, палову гэтага часу прасядзеў у турмах, дзе таксама не пакідаў літаратурнай дзейнасці, прымаючы ўдзел у рукапісным журнале палітзняволеных. У 1939 годзе на грошы, сабраныя сялянамі, выдаў невялічкі зборнічак вершаў «Жураўлiным шляхам». Творы паэтаў Заходняй Беларусі адлюстроўвалі невыносны прыгнёт, цяжкія ўмовы жыцця ў панскай Польшчы. У зборніку «Жураўлiным шляхам» змешчаны 24 вершы. Вось назвы некаторых з іх: «Калыхала зыбку маці», «Не вярнуліся назад», «Кажуць, гора заела», «Нам не чакаць вясны». Гэтыя назвы гавораць самі за сябе. Цудоўны верш «Калыхала зыбку маці»:

Калыхала зыбку маці,
Калыхала,
— Ой, бяды не будзеш знаці, —
Мне пяяла.
— Будзеш сонцу ўсміхацца
Залатому,
Сэрца цешыць, любавацца
Грошаў звонам.

Заканчваецца верш:

Ды аднаго не ўгадала
Мая маці.
Няма сонца залатога
Усміхацца.

А ў другім вершы паэт пытаецца:
Ой, ты доля, доля,
Палыновы цвеце!
Ці-ж то нам ніколі
Сонца не засвеціць?

Але паэта не пакідала надзея на блізкае вызваленне з-пад панскага ярма. У вершы «Капаем» С. Хмара сцвярджае:
Капаем, капаем праз цэлыя дні, —
Магілу капаем праклятую!
Прыедзе вясна к нам на сонцы-кані!..
Капайце-ж, лапаты, капайце!

Анатоль Іверс — вясковы хлапец з-пад Слоніма, вучыўся ў Віленскай беларускай гімназіі, якая з часам ператварылася ў філіял польскай гімназіі; за час вучобы за непаслухмянасць ён тры разы выключаўся з польскіх навучальных устаноў. Іверс — лірык, ён з натхненнем гаворыць аб беларускіх паэтах Трусу, Броўку, Глебку, многія вершы якіх ведае напамяць. Вершы Іверса, як і Хмары, ілейна насычаны, яны плаўныя і залушэўныя. Іверс таксама выдаў адзін зборнічак вершаў, але цэнзура значна сказіла іх.

З прыходам Чырвонай Арміі на тэрыторыю Заходняй Беларусі прынесена вызваленне народу, яго песням, яго творчаму слову. І зазвінелі іншыя песні, свабодныя песні, вызваленае слова.

У Слоніме, Баранавічах, Навагрудку, Стаўбцах і іншых гарадах вызваленай Заходняй Беларусі пачалі выходзіць беларускія газеты. З усіх канцоў краю пасыпаліся ў гэтыя газеты пісьмы, новыя творы новых паэтаў, апяваючых радасць вызвалення, музыку перамог.

Ефім САДОУСКІ.

гор. Слонім, Заходняя Беларусь.

Кузьма ЧОРНЫ

Дарагуся

Апавяданне

АДЗІНАЦЦАЦІГАДОВАЯ Люся была зусім хворая. Ужо гадоў два як хвароба сушыла яе. Добрыя суседкі, тужачы аб Люсі, заўсёды казалі:

— Каб гэтаму дзіцяці жыццё іншае, то яно не было-б хворае.

Можа і праўда, што Люся была хворая ад свайго жыцця. Яна ляжала на лаве пад акном і маці, глядзячы на яе, думала пра тое, што Люся апошнімі часамі стала нейкая доўгая, выцягнулася ростам. Можа Люся здавалася такой доўгай таму, што за апошнія дні вельмі схуднела, але маці сілком цешыла сябе думкамі: «Можа гэта Люся пашла ў рост, а калі так— то можа гэта яна перасіліла хваробу. І можа мая дачушка будзе жыць». Як кіпела матчына душа ад такіх думак! Усё, на што толькі здолен чалавек, можна аддаць, абы толькі жыла Люся.

Ужо другі дзень, як у Люсі з'явілася новае імя. Раней была—Люся, а цяпер стала — Люся-Дарагуся. Гэтае слова ўзбрыло на матчын язык само сабою:

— Дачушка, Люся-Дарагуся, можа табе лепш сёння?

Люсі было і не лепш і не горш. Яна прывыкла ляжаць на гэтай шырокай лаве каля акна за сталом. Яна глядзела ўгару, у вакно. Ёй відна была вяршаліна старой высокай грушы, якая расла ў іхнім двары. Груша была ўжо голая і толькі на адной галіне трапяталіся два жоўтыя лісткі. Яшчэ тым годам Люсю глядзеў мястэчковы фельчар. Ён сказаў:

— Калі хочаце, каб яна стала здаровая, то праўце яе лёгкім мясам і ўсякай такой добрай ядой.

У гаспадарцы тады было тры курыцы, і Люся дзён пятнаццаць правілася. Але гэта было даўно, а таго часу прайшла восень, зіма, вясна і лета, і цяпер зноў прышла восень. Лежачы на сваёй лаве, Люся думала пра тое, што цяпер вельмі добра быць на двары: шпарка прабягаюць па небе хмары, раз-пораз высвечвае сонца, каля плоту цвіце блакітненькая дробненькая астрачка...

Жоўты лісток адарваўся ад грушы, пакруціўся ў паветры і прыліп да аконнай шыбы. Следам за лістком дробная птушка стукнулася ў шкло і пырхнула назад на грушу. Шчаслівая ўсмешка павольна прайшла па Люсіным твары. Ёй захацелася ўзяць жоўты лісток у рукі. Ён, здаецца, мокры, на ім чорныя крапінкі, ён — частачка асенняй свежасці.

Босы і высокі ўвайшоў у хату бацька. Што гэта ён увайшоў, а не хто іншы— Люся не глядзячы ведала, бо адразу запахла дымам з папяросы і пачуўся шоргат аб сцяну яго злубянелага кажушка. Ён сеў на лаву пры сцяне.

— Тата, — сказала Люся, — ідзі прынясі мне гэты лісток з вакна.

Бацька адразу пайшоў. Неўзабаве ён стаяў у акне і падміргваў Люсі. Зноў вялая ўсмешка прайшла па Люсіным твары. Праз мінуту Люся гладзіла жоўтым лістком свае губы.

— Дарагуся, — сказала маці, — табе пара есці.

— Я не хачу.

— Але-ж табе трэба правіцца.

Гэты довад быў даволі моцны, трэба было есці хоць нехаця. Маці забразгала засланкай. Запахла грыбной патравай. Гэта была цудоўная грыбная верашчака. Маці цэлую восень дзень пры дні хадзіла досвіткам у лес і насушыла многа грыбоў. Цыбуля з агарода была свая, а ў дзежцы стаяла яшчэ крыху мукі. Гэтай мукі можа яшчэ хапіць на два скупыя хлябы. Чым жыць далей — аб гэтай бядзе страшна было думаць, але пакульшто яшчэ было што есці.

Дарагуся прыўзнялася на сваёй пасцелі і закашлялася. Маці ўзяла яе пад плечы і трымала, аж пакуль не скончыўся кашаль, а кашаль быў страшны і жоўты.

— Еш, Дарагуся.

— Мамачка, я раней адлыхаюся.

І лежачы, і адлыхваючыся пасля кашля, Дарагуся яшчэ ўсё бытцам адчувала на сваёй шчацэ шорсткія матчыны пальцы. Рукі гэтыя былі чорныя, патрэсканыя, пасівераныя, з іх ужо не адмывалася брудная чарната. І постаць матчына была прыгорбленая, і твар абветраны шэры, і валасы з-пад дзіравай хусткі выбіваліся над ілбом, і ўся на латах вопратка на яе няспрытна і няроўна сядзела на ёй. Дарагуся працягнула руку, узяла матчыну руку, пацягнула да сябе і папалавала ў каструбаваты палец. Маці адвярнулася, каб Дарагуся не ўбачыла, што яна душыцца слязамі. Але хітрая Дарагуся ўсё ведала і, каб увесці ўсё ў абыклую раўнавагу, сказала:

— Давай, мама, буду есці.

Маці пачала карміць сваю Дарагусю, але тая, пасля трэцяй лыжкі, пачала прасіцца:

— Мамачка, я хіба пасля даем, без солі вельмі-ж нясмачна.

Без солі нясмачна, але дзе тае солі ўзяць? Маці не мучыла Дарагусю ядой без солі.

— Сцяпан, — сказала жанчына мужу. — Дарагуся не можа есці без солі.

— Я пайду пашукаю солі, — панура адказаў чалавек. — От зараз пайду.

Ён навят не глянуў у жончыны вочы. Пагойдваючы шырокімі плячыма, ён прайшоў да сярэдзіны вуліцы і спыніўся ў здуме. Куды ісці? У гэтай дробнай дванаццаціхатняй вёсачцы ўсе жылі так, як і ён. А солі не было дзе, і не было за што дастаць. Але Дарагусі трэба есці і марудзіць нельга. У яго з'явілася думка, можа яна будзе шчаслівая. Ён шпарка рушаў за вёску. Дзьмуў вецер, але было цёпла. Сонца свяціла над мокрай зямлёй. Праз мінут дзесяць ходу ён дайшоў да кляновых прысад. У панскім гумне гула малатарня, парабкі і парабчанкі завіхаліся каля саломы з віламі і граблямі. Сцяпан чагосьці пастаяў каля манежа, дзе два хлапчукі паганялі ў кругу дзве тройкі коней. За дзядзінцам была панская кухня. Сцяпан увайшоў туды. Кухенная дзеўка мяшала ў чыгуне нешта скварэнае для пакаёвых слуг. «З соллю варылі», — падумаў Сцяпан.

— Кухара няма? — запытаў ён.

— А нашто?

— Я хацеў папрасіць лыжку солі.

Дзеўка зірнула ў бярозавы кадаўбец, пасля патрэсла яго ў руках.

— Няма, усю высыпала ў чыгун, — сказала яна. — Дала-б, ды няма. А ключы ад каморы ў кухара, а яго няма.

— А дзе ён?

— Пашоў япрука калоць. Павінен быць за свірнам.

Сцяпан пайшоў за свіран і адразу падаўся назад. Кухар разбіраў там ужо смаленага япрука, а з боку стаяў сам пан і ад няма чаго рабіць глядзеў, як кухар рэжа свежае сала на вялікія пласты, упіскае ў кубел і сыпле зверху соль. Соль стаяла тут-жа ў мяшку. Каля кубла на зямлі соль была рассыпана, можна былоназграбаць жменю, калі не прасіць у кухара, але ні таго ні другога чалавек не мог зрабіць: ён не мог паказвацца на панскія вочы. Справа была такая, што дванаццаціхатняя вёска ў часы рэволюцыі выбудавалася ўся на панскай зямлі. А калі ў гэтым месцы ўсталявалася польская дзяржава, пан пачаў зганяць людзей з зямлі. Зямлю адабраў, а наконт хат зрабіў ласку: пасля доўгіх людскіх просьб злітаваўся і згадзіўся не скідаць з пляцоў хат, але людзі павінны былі плаціць яму за займаемае месца штогоднюю арэнду. Плаціць гэтулькі, колькі, паводле яго ўласных вылікаў, занятая зямля магла-б даць прыбытку. Некаторыя, пацягнуўшы гадоў некалькі такой арэнды, спураліся і хат, а Дарагусін бацька не мог адважыцца сыйсці з сям'ёю ў беспрытульнасць і нейк усядзеў аж дагэтуль на сваіх трох градах. Але цяпер ён вінен пану, ужо даўно прайшоў тэрмін, а плаціць не было чым. Пан сам займаўся гэтымі справамі і ведаў Сцяпана ў твар.

Сцяпан без солі ўвайшоў у сваю хату. Маці стаяла каля Дарагусі, трымала ў руках скрутак белага палатна і гаварыла:

— Ты зараз паправішся, будзеш здаровая, і табе будзе такое добрае плацце з гэтага палатна! Хочаш? Мы ўдваіх з табою вышыем табе плацце. Будзем вышываць крыжыкамі, чырвоных і чорных нітак я дастану.

Бацька здагадаўся, што маці глушыць свой смутак і весяліць Дарагусю. Павярнуўшыся галавой у кут, ён сказаў:

— Увечары дастану солі.

Маці паклала палатно на стол. Гэта было цудоўнае палатно. Маці яго вытка ла яшчэ тады, калі была дзяўчынай, выткала сабе ў пасаг. Больш як дваццаць год яно праляжала ў куфры, як самая дарагая рэч, якая была ў гэтых людзей. Калі вырасце Люся, яна будзе франціць у тонкім вышытым плацці. Цяпер Люся стала Дарагусяй і — абы толькі яна паправілася — няхай малая носіць тонкае палатно! Абы толькі яна жыла!

Прышоў вечар. Сцяпан шпарка ішоў кляновымі прысадамі. Вось ён дайшоў да таго месца, дзе ўдзень ён бачыў рассыпаную соль. Ён нагнуўся і правёў рукою па зямлі. Як ён не падумаў пра тое, што зямля была мокрая ад дажджоў і соль ужо растала! Поўны смутку, ён разагнуўся і ўбачыў, што дзверы ў свіран адчынены і там гарыць святло. Ён зірнуў у сярэдзіну і штосьці падобнае да раптоўнай усмешкі перасмыкнула рысы яго твару. Пасярод свірна стаяў адчынены, той самы, кубел з салам. На сале тоўстым пластом ляжала соль. Ён ускочыў у свіран і пачаў грабці соль. Нікога нідзе не было.

— Сала крадуць! — грануў над яго вушыма голас, і панскі кухцік, дробны і заіклівы, абхапіў ззаду Сцяпана за плечы. У той-жа момант загрукалі на падлозе боты і нехта другі навалійся на яго.

— Бі злодзея! — лемантаваў кухцік.

Сцяпана паваліді на падлогу і той другі ўскочыў з каленьмі на грудзі. Яны пачалі біць.

— Братачкі, родненькія, я не чапаў сала, гэта я хацеў солі жменю ўзяць. У мяне дзяўчынка ўміраe ад сухот і не можа есці без солі. Яна з вечнага голаду ў сухотах.

Ніхто яго не слухаў. Калі кухціку здалося, што збойства даволі, ён адбегся ўбок і пачаў глядзець на злодзея. Са счарнелым тварам, той падняўся і сеў.

—Я не магу ўстаць,—сказаў Сцяпан і захліпнуўся слязамі.

Кухцік памаўчаў, падумаў, расшпіліў і зноў зашпіліў сваю вопратку і паставіў Сцяпана на ногі.

— За што ты мяне, каб цябе бог пакараў.

Кухцік моўчкі пастаяў, пасля нагроб жменю солі і ўсыпаў чалавеку ў шапку.

—Сып больш,— застагнаў Сцяпан.

Кухцік усыпаў яшчэ дзве жмені.

— Ідзі, — сказаў кухцік, — я свіран буду замыкаць.

Чалавек паклыпаў у цемені асенняга вечара. Яму было цяжка дыхаць і прыемна адчуваць, як спухлы твар абвяваецца ветрам.

У хату ён не зайшоў. Прытуліўшыся плячуком да грушы, на якой удзень трапяталіся два жоўтыя лісткі, ён доўга чакаў, пакуль жонка вышла з хаты. Тады ён зрабіў выгляд, што толькі-што ўвайшоў у двор.

—Кацярына, я прынёс солі...—прашаптаў ён праз сціснутыя зубы.—на, у шапцы. Салі, няхай Дарагуся есць.

—Дарагуся заснула,—сказала Кацярына.—На змярканні ёй было так дрэнна, яна так аслабела! А гэта заснула, можа ў сне яна памацнее. Ах, каб пашло на папраўку!.. Дзе-ж ты дастаў солі?

Якім родным быў для яго яе голас! Толькі як-бы гэта, каб не паказацца ёй повідну з такім тварам?

— Гаспадар дома?—закрычалі раптам пад акном, і двое людзей ўвайшлі ў двор. Сцяпан уныў.

Ён пазнаў панскага аканома і гмінага паліцэйскага.

—Я схаваюся, скажы, што мяне дома няма,—зашаптаў ён і пабег цёмным двором за хату. Мінут дзесяць ён там чакаў.

—Арэнду за пляц,—сказала Кацярына падыходзячы да яго.—Калі заўтра зранку не заплацім,—заўтра-ж выганяць з хаты. Пабудзілі крыкам Дарагусю, яна гаварыць не можа, у яе мову адабрала... Божачка, што нам рабіць! На, бяры,—совала яна яму ў рукі палатно—хутчэй ідзі знайдзі якога-небудзь купца, прадай, з хаты заўтра выганяць. Праз усё жыццё хавала для Дарагусі палатно... Божа мой, божа... Абы толькі яна была здаровая...

Ён хапіў палатно і пабег з двара. Ён ужо ні аб чым не думаў, абы толькі знайсці купца. Яго не было цэлую ноч. Ужо світала, калі ён, хістаючыся ў бакі, прайшоў паўз вокны сваёй хаты. Цела яго ныла і твар быў як у агні. Падпахай ён трымаў скрутак палатна. Страшная, як цень, Кацярына вышла яму насустрач.

— Палатна не прадаў, няма каму прадаваць,—сказаў ён вінавата.

— Дарагуся памерла! — закрычала Кацярына і не магла заўважыць счарнелага Сцяпанавага твару.

Ён кінуўся ў хату. Кацярына, як асупянелая, стаяла на яго дарозе. Ён хапіў яе за плечы і пхаў перад сабою. Скупое святло асенняга рассвітання цадзілася праз вокны. Дарагуся ляжала на сваім ранейшым месцы, выцягнутая, доўгая. Учарашні жоўты лісток з грушы валяўся каля лавы, на зямлі. На стале была шапка з соллю.

— Дарагуся, табе асталося тваё палатно! — рвануўся дзікі Кацярынін енк. Яна выхапіла з Сцяпанавых рук палатно і накрыла ім Дарагусю. Сцяпан кінуўся на двор, доўга чагосьці шукаў там, круцячыся на адным месцы, пасля знайшоў: прыпёрся лбом да мокрага ствала грушы і застыў як анямелы. Над яго галавой трапятаўся жоўты лісток.

— Няхай выганяе з хаты, няхай, — мармытаў ён, адчуваючы бытцам шчасце ад таго, што яго выганяць з хаты.

Яго ўвёў у прытомнасць нейкі дзіўны гул. Ён ачнуўся і падумаў, што трэба ісці разжывацца дошчак на труну. Нечуваны ніколі раней ім гул шырыўся і рос. Ён убачыў, як полем ішлі нябачаныя ім раней машыны. Пасля ён убачыў на вуліцы новых людзей. Гэта былі чырвонаармейцы. Павольнай хадой ён рушыў да іх, пасля рвануўся ў нястрыманым парыве. Ён зразумеў усё.

— Братка, — закрычаў ён, кідаючыся на шыю першаму чырвонаармейцу.

— Братка, ратуй! Знішчай іх! Калі дзе ўгледзіш пана — не шкадуй. Прасіцца будзе — не вер, пакуль не здохне!



Скульптурны партрэт (бюст) Серго Орджанікідзе, зроблены заслуж. дзеячом мастацтваў БССР скульптарам З. І. Азгурам для выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Фотахроніка БЕЛТА.

ЗЯМА ЦЕЛЕСІН.

ДВА ВЕРШЫ

I.

Білет на Вільна

Глянь на горад, — цьма народу.
Не бяжы — ідзі ты ціха.
Ты-ж не мчаўся так ад роду,
Што нясе цябе, як віхар?

Што з табой сягоння стала?
Пашкадуй свае ты ногі.
Мне патрэбна да вакзала,
А не бачу я дарогі.

І здаецца зрок мой пільны:
Дзе-ж будынак той вакзала?
Разумееце? На Вільна
Мне білет патрэбен зараз.

Трэба быць мне гэтым часам
Там, дзе вецер вольны вее,
Прывітаць каб з добрым часам
Беларусаў і яўрэяў.

Прывітаць мястэчкі, сёлы.
Дзе татуля, дзе ты, маці?
У абдымках спеў вясёлы
Будзем разам мы спяваці.

У слязах мае расніцы
Дзе тут каса, што за ліха?
Скрозь па вуліцах сталіцы,
Я нясуся нібы віхар.

II

Хлеб—соль

Ні хлеба, ні солі, ні к страве закрас,—
Да ніткі апошняй разграбілі нас.

А госці ідуць к нам. Прахадзяць вунь
гаць.
А чым-жа нам родных гасцей
сустракаць?

І маці ўздымае сарочку з крывёй
Дзіцяці, якое засеклі лазой.

Нібыта ўзнімае зруйнаваны край,
Наскрозь акрываўлены каравай.

На тракт усе выйшлі ў слязах
грамадой, —
А хлеба і солі, і мірны спакой,
Чырвонае войска прынесла з сабой.

З яўрэйскай мовы пераклаў А. БЯЛЕВІЧ.

Г. БЯРОЗКІН

ВЕРШЫ З. ЦЕЛЕСІНА

У вышаўшай нядаўна першай кнізе вершаў З. Целесіна «На сваёй зямлі» прадстаўлены творы самых розных творчых узроўняў і самых процілеглых паэтычных імкненняў. І ўсё-ж кніга ў цэлым робіць радаснае ўражанне. Прычынай гэтага з'яўляецца незвычайная жыццёвасць вершаў Целесіна, іх сапраўдная, а не пракламіраваная сувязь з рэальнай савецкай рэчаіснасцю. Вершы гэтыя маюць свой уласны свет, межы якога вельмі лёгка ўстанавіць.

З. Целесін піша пераважна аб старым і новым Палессі, аб аднаўленым яўрэйскім мястэчку і яго жыхарах — простых і здаровых людзях, якія прызнаюць жыццё, даверанае іх уласным рукам і адкідваюць усякую пабочную і прыніжаючую апеку над імі. Цяжкое жыццё цягнулі гэтыя людзі да набыцця сваёй роднай савецкай зямлі. Не ў плане агульных і сантыментальных лямантацый-скаргаў на невыноснасць жыцця ў мінулым, а ў плане дзейсных вобразаў, самастойна падгледжаных і вылучаных з жыцця, паэт здолеў перадаць усю жорсткую бессэнсоўнасць старога местачковага быцця. У выдатнай «Баладзе аб скрыгалаўскім тракце» сам па сабе сюжэт, без усякіх растлумачэнняў, дзякуючы яўнай сваёй нарачытай бязглуздзіцы (местачковая дзяўчына, якая едзе к свайму жаніху ў суседняе мястэчка, пагрузла ў непраходным балоце і тры гады не вылазіла з яго), паказвае на сапраўдную неразумнасць і бессэнсоўнасць старога местачковага ўкладу жыцця.

Вершы Целесіна лірычныя, у іх адчуваюцца зацікаўленыя і актыўныя адносіны паэта да жыцця. Прычым, лірызм паэта разнастайны ў сваіх формах, у залежнасці ад матэрыяла, ад тэмы і ад паэтычных адносін да тэмы. У той-жа «Баладзе аб скрыгалаўскім тракце» лірызм паэта адценен гумарам.

У вершы «З дзіцячых год» лірыка Целесіна набывае трагічна-напружаны характар, у ім адчуваецца сапраўдны боль. У вершы «Бабульчыны рукавічкі», у якім Целесін паэтызіруе пяшчотныя дзіцячыя ўспаміны, захаваўшыяся ў далёкім куточку памяці, лірычны пафас атрымлівае зусім новае гучанне незвычайнай дзіцячай чыстаты і непасрэднасці. Але і ў гэтым вершы трагічна-напружаная нота гучыць па супярэчлівым ёй агульным фоне дзіцячага апавядання, як указанне на глыбокую трагічнасць мінулага жыцця. Вось бабулька, робячы рукавічкі, апавядае ўнуку аб «птушцы-сіраце», чыім «адзінокім плачам заліваліся лясы», і гэта ўмела ўведзеная ў верш фальклорная рэмінісцэнцыя робіць бяскрыўднае, здавалася-б, дзіцячае апавяданне шматзначным і глыбокім. Раптам, як гаворыцца, зрабілася «далёка відаць ва ўсе канцы свету».

Адчуванне ўдачы і самастойнасці суправаджае тыя вершы Целесіна, у якіх асабістыя адносіны паэта к свету выражаюцца не ў нарачыта-стылізаванай форме, а проста, натуральна і вольна. Вось верш «Загад Варашылава», у якім паказана ўступленне Чырвонай Арміі ў яўрэйскае мястэчка, вызваленае ад польскіх акупантаў і рабаўнікоў. Тут сама па сабе выбраная паэтам песенная форма з'яўляецца выражэннем унутрана-святочнага стану, калі звычайнае, здавалася-б, слова не выгаварваецца, а спяваецца. І маткі, што плачуць ад радасці, на крывых парогах мястэчка, і стомленыя коннікі, і няхітрая песня з часта паўтараючыміся радкамі — усё тут зліваецца ў адным цэльным адчуванні ад паказанай паэтам карціны. Тое-ж самае можна сказаць і аб вершы «У радасці», у якім З. Целесін своеасабліва паэтызіруе сумную песеньку беларускай дзяўчыны аб «святочна прыбраным жарабку», аб жаніху «у новым картузе», аб уласным разбітым шчасці.

Целесіну добра ўдаецца нацюр-морт. Ён нагляданы і можа ў адной дэталі перадаць цэлую карціну. У вершы «Смага» адчуванне праздзельнай распаленасці, спёкі, смагі перадана адной выразнай дэталлю: «Здаецца, дакраніся да чаго-небудзь і выб'еш іскру ты...»

Усё гэта з'яўляецца, безумоўна, станоўчай якасцю паэта З. Целесіна.

Аднак, многае ў яго кніжцы «На сваёй зямлі» можа выклікаць сур'ёзныя супярэчанні. Нам здаецца зусім беспадстаўным жаданне паэта Целесіна цэлым радам штучных метадаў і сродкаў «захаваць» сваю ложна-зразумелую арыгінальнасць. Целесіну здаецца (а гэта вельмі моцна адчуваецца ў вершах), што своеасаблівасць паэтычнага голаса, першароднасць паэтычных адносін к свету ствараецца захаваннем сваёй сувязі з якім-небудзь бытавым ці нават этнаграфічным матэрыялам. Устойлівасць гэтага матэрыяла і ёсць устойлівасць творчай манеры паэта. Так прыкладна разважае Целесін (як гэта вынікае з яго вершаў), і жорстка памылецца. Целесін вельмі моцна клапоціцца аб прыўнясенні ў свае вершы мясцовага «палескага» каларыта, характэрных слоўцаў, зразумелых толькі яму, бытавых прыватнасцей, вядомых толькі жыхарам яўрэйскага мястэчка Палесся. Не гэтымі шляхамі працякае паспяванне сапраўднай своеасаблівасці ў паэзіі. Яно больш глыбокае, і мяркуе ў якасці першачарговай сваёй умовы цэльнасць і самастойнасць паэтычнага мыслення, наяўнасць вялікай агульна-чалавечай, а не толькі вузкакраявой і этнаграфічнай тэмы. Асабліва добрыя тыя вершы Целесіна, у якіх паэт забывае аб сваіх пастаянных клопатах «захаваць» сваю манеру, «бараніць» свой голас, «зацвердзіць» сваю арыгінальнасць. Гэтыя вершы хвалююць сваёй вялікай праўдай і сапраўднай навізнай, якая адчуваецца ў іх. Але што сказаць аб тых вершах, у якіх Целесін займаецца непатрэбнай стылізацыяй, бясплодным вышукваннем характэрных слоўцаў? Гэтыя вершы дрэнныя ў самай сваёй сутнасці. Яны ўяўляюць сабою ложную творчую тэндэнцыю.

Трэба аддаць справядлівасць: Целесін добра адчувае прыроду. Гэтае пачуццё прыроды ўваходзіць, па яго думцы, слагаемым у агульную суму, якая называецца «творчай манерай» паэта Целесіна. І вось зноў-такі ўдалыя тыя прыродаапісальныя вершы Целесіна, у якіх паэт забываецца аб «слагаемых», і аб «суме», і аб «творчай манеры», і зусім няўдалыя тыя вершы з прадузятым і падкрэсленай «целесінскім» «пантэізмам». Там самі па сабе вычурныя вобразы пачынаюць паўтарацца з верша ў верш. Параўнанне сябе з дрэвам, якое павінна выразіць пантэістычную злітнасць паэта з прыродай, пачынае надакучаць у вершах Целесіна. «На мне, як на дрэве, блішчыць раса», «я ў зямлю-б тут укапаўся, як асіна», «я руку выцягнуў, як галінку», «я у чорную зямлю-б тут дрэвам урос», «я спяваў-бы як сасна на ветры» і г. д. Паўтараюцца ў вершах Целесіна і паасобныя знешнія адзнакі фальклора. Усё гэта пакуль стварае ўражанне скаванасці паэтычнага голаса таленавітага паэта Целесіна.

Над многім трэба прызадумацца З. Целесіну. Далейшае яго развіццё павінна ісці ў напрамку к вялікай тэме, к вялікім чалавечым пачуццям і мыслям. У сэнсе магчымасцей і сіл для роста Целесіну дадзены вельмі многа.



Палац піонераў і акцябрат у Мінску. Фота І. Каплінскага.

ГІРШ КАМЯНЕЦКІ

У пастаяннай крыўдзе на багацеяў і эксплаататараў, у непрымірымай нянавісці да іх, у цеснай сувязі і залежнасці ад фальклорных матываў яўрэйскай народнай масы нарадзіўся і мацнеў верш Камянецкага. Паэзія Камянецкага з горычу апавядае аб тых, «хто цягнуўся за хлебам, абяцаным у казках, у той час, як зубы абцугамі ім ірвалі...» І вось гэта велізарная ненасытная крыўда за тое, што бацькі і маці ніколі дасыта хлебам не наядаліся; крыўда, якая імкнулася сябе ўцешыць вымыслам аб «вялічнаступаючых конях, аб разбойніках, якія нападаюць у лясах на цароў, гандляроў, талстасумаў»; вось гэта крыўда прымусіла паэта апрануць шынель, узяць вінтоўку і пайсці змагацца за справу рабочых і сялян. І мала хто з яўрэйскіх савецкіх паэтаў з такой любоўю апеў незабыўныя годы грамадзянскай вайны.

Камянецкаму не забыць аб днях грамадзянскай вайны, аб днях, калі «кожны баец быў паэтам, а кожны паэт байцом». «Адно забыць ніяк не магу, і вершаў тады я не пісаў, калі вершы чытаў я пад свіст куль, пры ціхім полымі тлеючых хатак».

Рэвалюцыйны пафас робіць верш Камянецкага ўрачыстым і надае яму своеасаблівае эпіка-рамантычнае гучанне. Пафас Камянецкага не рытарычны, не штучна-крыклівы, ён натуральны і просты, «і таму, што кроў пяе ўва мне, і таму, што на сэрцы добра, я пачынаю гэты сказ задушэўным, ціхім словам».

Часта Камянецкі звяртаецца да мінуўшых баявых дзён. «Сэрца выходзіць з берагоў і адносіць мяне туды, дзе тысячы леглі на палях, каб мільёны іншых прабудзіліся...» Але было-б памылкова сцвярджаць, што Камянецкі паэт выключна батальных успамінаў, што тэма грамадзянскай вайны з'яўляецца адзінай тэмай яго творчасці. Камянецкі паэтэпік па пераважнасці, апявае і нашы сацыялістычныя будні. «Я хачу, я мару здаўна аб тым, каб кожны новы дом у краіне быў пагружан у зелень. І я не стамлюся сцвярджаць аб адным: той, хто пазнаў вялікую цяжкасць, той будзе прагнуць радасці і шчасця...»

Паэтычнаму дараванню Г. Камянецкага ўласцівы гумар. Паэту добра знаёмы недарэчныя спадзяванні некаторай часткі яўрэйскіх працоўных, якія давяралі свой лёс нейкім звышнатуральным фантастычным сілам. З усмешкай на вуснах паэт выкрывае ілюзорнасць гэтых спадзяванняў.

Камянецкі любіць спакой, але толькі спакой мірнай працы, а не спакой перанасычанага святкавання. Яму прыкра спакойнае жыццё мешчаніна. Нават, калі паэт знаходзіцца ля мора, якое ўкалыхвае пачуцці, мірная цішыня пачынае яго здалёку трывожыць, ён усклікае: «Ад лішку спакою і цішыні, я развучыўся здаецца любіць і ненавідзець». Паэт імкнецца да актыўнага дзеяння, ён апявае магутную волю, якая пераварае свет. «Я цяжкасцей не страшуся, няхай будзе нават боль, але толькі, той што вядзе да любві, да нянавісці, да дзеяння...»

Г. Камянецкі шмат чаму навучаўся ў бязымянных стваральнікаў яўрэйскага фальклору. Яўрэйская народная песня суправаджае творчасць Камянецкага, пачынаючы з самых ранніх яе крыніц.

Па характару свайго даравання Г. Камянецкі — рамантык з вялікай цягай да эпічнага апавядальнага элементу. І гэтыя яго характэрныя асаблівасці, якія найбольш поўна адлюстраваліся ў вершах аб грамадзянскай вайне, «Баладзе аб ваўку і электрастанцыі», у іранічным «Пісьме Нью-Іоркскай цётцы» і іншых вершах, выгодна вылучаюць таленавітага паэта Г. Камянецкага з агульнага хору нашай растучай паэзіі.

У. ФІНКЕЛЬ.

„РЕВИЗОР" Н. В. ГОГАЛЯ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Пісьменнік Кузьма Чорны закончыў пераклад на беларускую мову камедыі Н. В. Гогаля «Ревизор». Камедыя будзе пастаўлена Белдзярждрамтэатрам у сезоне бягучага года.

У гутарцы з супрацоўнікам рэдакцыі «Літаратура і Мастацтва» тав. Чорны паведаміў некаторыя падрабязнасці перакладу. Пераклад быў вельмі цяжкі, бо героі камедыі — чыноўнікі XIX стагоддзя — маюць у камедыі сваю спецыфічную, канцылярскую мову і ў беларускай мове часта няма адпаведнай тэрміналогіі таго часу. Прыходзілася падшукваць адэкватныя выразы, якія ў той-жа час не парушалі-б гогалеўскага стылю.

Некаторую дапамогу ў перакладзе аказалі так званыя «Мінскія акты» (старыя архіўныя дакументы), дзе сустракаюцца канцылярскія выразы з «мясцовым» каларытам. Для перакладу часткі тэрмінаў часам прыходзілася карыстацца старой беларускай мовай, часам ствараць новыя спецыфічныя выразы ў духу сучаснай беларускай мовы.



Скульптурны партрэт (бюст) Я. М. Свердлова — адна з апошніх работ заслуж. дзеяча мастацтваў З. І. Азгура.

Фотахроніка БЕЛТА.

Першая радасць

Безліччу промняў
Сонца паліла жыты.
З прагнасцю яблыкі
Падаюць к травам прыгрэтым.
Я ўбачыў, здаецца,
Як першыя жоўкнуць лісты,
Як восень віецца
Павуцінкамі баб'яга лета.
Чырвоны малліннік...
(Пад Мінскам такія-ж кусты).
Сцяжынку да лесу
Тапталі тут босыя ногі.
Мне Нёман гасцінна
Свае рассцілае масты.
Я грэбляю есу.
Ты моўчкі стаіш ля дарогі.
... Зірнулі у вочы.
Пазналі адзін аднаго.
Твой позірк
Маю прыгадаў мне навесну.
Я агрэставы сок
Піў са жбана твайго...
(Пад Мінскам такія-ж агрэсты).
Здалося,
З табою я іх сабіраў на зары,
З табою —
Шаўкамі
Я сцяг вышываў перад маем.
З табою —
Ад калыскі былі мы сябры
(хіба-ж граніца сяброў разлучае?!)
Я грэбляю есу.
Я дружбу узнёсла пяю:
Хай песня даўжэй
Затрымае спатканне хвіліны.
. . . .
Маленькую зорку,
Як першую радасць маю,
Здымае са шлёма
Сустрэтая мною
дзяўчына.

Ілья ЭЛЬКІНД.

★

ПАРАБАК.

З маленства выпаў лёс паганы:
З бядою еў, з бядою спаў,
Служыў ён парабкам у пана,
Крывёй разоры паліваў.

У хаце дымная лучына
Свет закрывала ад вачэй.
І гора рэбры падлічыла
Ў яго някормленых дзяцей.

І так да смерці. А у пана
Трашчалі гумны ад дабра,
Што ты здабыў рукой старанна—
Пан у кішэнь сабе забраў.

А з-за мяжы, з палёў калгасных,
Прыносіў вецер спеў дзяўчат,
І сказ аб братняй долі шчаснай
Хадзіў пішком ад хат да хат.


І парабак не сцерпіў: «Годзе
Для ўцехі панскай карак гнуць!
Няхай для нас палеткі родзяць,
Няхай для нас сады цвітуць!»

А раніцой, калі зарою
Акроплен росны быў мурог,
Жандары наляцелі роем,
Звязалі, павялі ў астрог.

З нянавісцю на ліхадзеяў
Глядзела хмурае сяло.
І азірнуўся ён з надзеяй
На ўсход, дзе сонца узышло.

Ён верыў — прыйдуць на падмогу
З савецкае зямлі браты,
Каб радасную перамогу
Сустрэць пад сонцам залатым.

Пімен ПАНЧАНКА.



Беларуская поўная сярэдняя школа № 21 Варашылаўскага раёна гор. Мінска. У вялікіх і светлых класах вучацца 783 чалавекі. У распараджэнні школы — добра абсталяваныя хімічная, фізічная, біялагічная лабараторыі і фізкультурная зала.

Фотахроніка БЕЛТА.

Э. Каган

Вызваленне

Але вось здарылася ў старога Цімоха Падабеда такое ліха, горш якога быць не можа. 16-га верасня рэквізавалі яго адзіную кароўку, якую ён гадаваў божым цудам. Яе пагналі ў панскую абору, дзе стаяла шмат «рэкрутаў»—рэквізіраванай жывёлы.

Увесь вечар Цімох Падабед тупаўся каля панскай аборы. Ён хацеў яе падпаліць. Няхай усё гэта агнём і дымам пойдзе! Такое-ж цёмнае жыццё, няхай хоць на хвіліну пасвятлее. На хвіліну пасвятлее, а пасля надыйдзе навекі цёмны канец. Потым ён падумаў не пра тое, што ён ужо такі стары, з'езджаны, спрацаваны і што ў сваім схудалым змучаным целе ўжо не знойдзе ні кроплі імпэту, каб выканаць гэты ўчынак помсты. Ён успомніў аб тым, што ўжо другі тыдзень, як ніводнай запалкі не мае.

Ён лёг на ложак і застагнаў, нібы пры кананні. Навакол залемантавалі яго малодшыя сыны, дочкі, нявесткі, кумы і сваты. У хаце было мо' дваццаць чалавек, але кожны з іх меў сваю ўласную бяду і нядоля згуртавала іх у адно. Хата паўнютка поўна ліхам, нібы студня вадой. Не было патрэбы парасчыняць вокны, каб бяда расплылася навокал. Навокал стаялі пазачыненыя іншыя хаткі, біткам набітыя злыбедай.

Уночы Цімоху здавалася, што ўжо вось-вось неба зямлю прыдушыць. Гаротнаму чалавеку часта здаецца, што вада ўжо дайшла да горла і ён зараз захлынецца ўтопіцца. Але на старой бядзе садзіцца другая бяда і паганяе трэцяй бядою.

Пару дзён таму назад канфіскавалі яго невялічкі ўраджай з яго двух неўраджайных гектараў. Вельмі кепска, аднак будзе яго сям'я асталася на месцы. Будуць сілкавацца карой, калі не будзе мукі. Але можа быць яшчэ горш.

А вось змабілізавалі яго трох старэйшых сыноў. У хаце стала яшчэ больш нудна. Затое ў салдатах яны хоць самі будуць мець чаго есці. Але можа быць яшчэ горш.

Усё-ж такі горш, чым цяпер, быць не можа. Цяпер Цімоху ўжо прыходзіцца накінуць пятлю сабе на шыю. Ён не памеркаваў, што на гэта ў яго ўжо сілы не хопіць. Ён проста захапеў легчы ў свой ложак, каб больш адтуль не вылезці. Яму здавалася, што гэта вельмі проста—ён не вылезе з ложка і сканае. Колькі часу на гэта патрэбна такому старому, як ён? Зусім проста: захоча—вылезе і яшчэ будзе пакутваць пару год. Захоча—не вылезе і капут. Лепш не вылезе з ложка. Ці-ж можна жыць, яму, Цімоху, без трох сыноў, адзінай падпоры ў гаспадарцы, і без кароўкі?

Цімох ляжаў у ложку і чакаў смерці збавіцелькі. Чакаючы смерці, ён заснуў. І прысніўся яму цяжкі сон: нібы ўжо некалькі год ляжыць ён у ложку і не можа памерці. Вось, здаецца, пачынае канаць, але памерці сілы няма. Потым ён набіраецца новай сілы, каб памерці. Аднак, смерць не ідзе...

Перад Цімохам пачало праходзіць усё яго жыццё. Гэта яго абрадвала. Ён упэўніўся, што памірае. Бо толькі перад смерцю чалавек успамінае ўсё сваё жыццё. Усё жыццё Цімох пражыў у адзіноцтве.

Ён меў жонку, дзяцей, нявестак, зяцёў, сватоў, сваякоў, шмат даўгоў, падаткаў, нядоімкаў. Навакол было гэтулькі жывых і нежывых рэчаў, аднак ён быў адзінокі, вельмі адзінокі...

Адзінокі ляжыць ён цяпер у ложку і чакае смерці.

Ён успамінае, што часам ён нават смяяўся, калі апавядалі байкі пра ксяндзоў. Шмат баек чуў ён пра хітрых ксяндзоў і дурных баб. Часам ён і плакаў, калі паміраў сваяк. Ён ужо стары чалавек і ўсе яго равеснікі і равесніцы пачалі выміраць. Здаецца, усе чалавечыя пачуцці былі яму ўласцівы, але над імі панавала адно галоўнае пачуццё.

Вось гэтае самае пачуццё—адзіноцтва, якое ён адчувае цяпер, лежачы на ложку і чакаючы смерці.

Яшчэ ў юнацкія гады ён адчуваў сябе адзінокім. Ажаніўся і астаўся адзінокім. Яго жонка Маланка была маўклівай яшчэ з дзявочых год. Яна вельмі пакрыўдзіў яе да вяселля, а ён за гэта самае крыўдзіў яе пасля вяселля. А яна ўсё маўчала. Моўчкі яна насыпала яму поўную хату крыклівых дзяцей. А ён астаўся адзінокім нават калі яны падраслі, бо ён заўсёды быў бясхлебнікам, а пакуль дзеці даведаюцца, хто ў гэтым вінаваты, —яны думаюць, што ва ўсім вінаваты бацька. Бацька вінаваты, бо мае толькі два гектары зямлі і выплачвае некалькі дзесяткаў падаткаў.

Адзінока ён ляжыць у ложку ды чакае смерці.

Лежачы ў ложку, ён утаропіцца ў знаёмыя твары і бачыць усё нібы праз туман. Здаецца, Маланка, Палашка, Агата? А хто яго ведае, ці гэта Маланка, Палашка, Агата. Вочы бачаць, ці не? Вочы калі-небудзь бачылі, ці не?..

Хоць думкі блытаюцца, аднак ён цяміць, што ўсё яго жыццё было нейкае туманістае, цёмнае. Ён нават пачаў сумнявацца, ці сапраўды ён беларус. Пан гаварыў, што беларусаў наогул няма. А сусед асаднік кажа, што такое было, як ён, не можа быць і палякам. Ён ні то праваслаўны, ні то каталік. Ён хадзіў у касцёл, але яго бацька і ён сам былі калісьці праваслаўнымі. На якой мове ён гаворыць? Увесь тыдзень яна была падобна да беларускай, а ў нядзелю яна крыху нагадвала польскую. Ды ўсё жыццё—не жыццё, а нейкая вечная пакута. Недалёка ад вёскі савецкая граніца. Там, кажуць, сяляне добра жывуць.

Але і гэта для яго цёмна і туманіста.

Цяпер, лежачы ў ліхаманцы, шмат чаго прад яго вачыма становіцца ясней і ярчэй. Тысячы паноў, асаднікаў, ксяндзоў паўстаюць перад яго вачыма. З дзікімі крыкамі, з звярынымі тварамі, яны засланяюць перад ім сонца на ўсходзе. Яны крычаць і лемантуюць: гэта хлусня, хлусня, не з усхода ўзыходзіць сонца.

Адзінока ляжыць ён у ложку і чакае смерці.

Уночы моцна застукалі ў дзверы. Дзверы выбілі. Зайшлі некалькі палявых жандараў. Старшыя сыны ўцяклі з фронта, уцяклі з польскай арміі «багатырскай». Ці не хаваюцца тут яго сыны?

Цімоха моцна пацягнулі за бараду—а можа ён загрыміраваны салдат. Яму загадалі ўстаць. Тады ён сказаў заспаным голасам, што ён ужо пры смерці, але сілы не мае памерці. Яны выпітурхнулі з хаты двух малодшых сыноў, а Цімох застаўся ў ложку чакаць смерці.

А раніцою пачуліся крыкі «ура». Нявесткі не вытрымалі і выскачылі на двор. Яны зараз-жа вярнуліся кухты прыгажэйшыя, чым хвіліну таму назад. Яны праказалі ў адзін голас:

— Прыйшла Чырвоная Армія!

На іх галовах зараз-жа запалыхалі чырвоныя хусткі.

І ніхто-б не падумаў, што стары слабы Цімох знойдзе ў сабе сілу ды ўскочыць з ложка спрытна, як хлапчук. Зусім пра смерць забыў. За трыма чырвонымі хусткамі пабег і ён. А насупроць чырвоных хустак ішлі эскадроны чырвонай кавалерыі.

А насупроць чырвонай кавалерыі выйшла шмат-шмат жанчын у чырвоных хустках. А мужчыны з чырвонымі істужкамі на кашулях, на падраных світках. І надышлі святыя, рэдкія ў жыцці хвіліны, калі неспадзявана з'яўляецца здалёку сон на гарачых конях, а пасля аказваецца, што гэта ява, што гэта праўда. У гэтыя бессмяротныя хвіліны сэрца амываецца шчасцем, а вочы—чыстымі слязьмі. У гэтыя перапоўненыя хвіліны чалавек адчувае, што зараз ён адшыбне ад сябе бруднае, агіднае і пакутлівае жыццё ды апране на сябе новае, ззяючае і светлае жыццё.

І чырвоныя кавалерысты зышлі з коней і жанчыны ў чырвоных хустках абнімалі іх і палавалі, як братоў-вызваліцеляў.

Чырвонаармейцы танцавалі з жанчынамі ў чырвоных хустках, і апавядалі, і распытваліся, і бралі кветкі, а ў каго была лішняя зорка—аддаваў вызваленым. І ўсміхаліся, і смяяліся.

Цімох адразу пайшоў шукаць камандзіра. Ён павінен яму адразу сказаць пра тое, што ён, Цімох, такі стары ды яшчэ зусім не жыў. Ён павінен даведацца ў камандзіра, ці яшчэ ёсць надзея жыць

— Дзе камандзір?—запытаўся Цімох у бліжэйшага чырвонаармейца.

— Вось ён сядзіць!—паказаў яму чырвонаармеец на аднаго ў групе чырвонаармейца.

Цімох спыніўся і не пайшоў да гэтай групы. Яму здавалася, што камандзір нічым не вызначаецца ад іншых чырвонаармейцаў. Потым ён набраўся адвагі і падышоў. Ён адразу хацеў сказаць, што ён ужо такі стары ды яшчэ ніколі не жыў і ці ёсць надзея на тое, што ён зажыве пачалавечаму, але замест гэтага ён сказаў:

— Апошнюю кароўку забралі ў мяне ўчора.

— Дзе яна?—запытаўся, усміхаючыся камандзір.

— У панскай аборы. Вунь яна. Недалёка.

— Дык ідзі і забяры,—сказаў камандзір.

Тады Цімох падумаў, што гэта не камандзір, бо сапраўдны камандзір не пачне высміваць са старога чалавека.

— Мо' жартуеш, малады, са старога? Пайду да галоўнага камандзіра.

— Я галоўны камандзір.—Ён зноў усміхаўся.—Не верыш мне, дзядок? Я вельмі проста выглядаю, так?

І раптам з вуснаў гэтага-ж камандзіра грымнула каманда:

— Эскадроны, на коней!

І сотні чырвонаармейцаў у адно вокамгненне ўскочылі на коней і сталі ў роўныя рады. Насупроць іх засталіся толькі камандзір і стары Цімох. Перад старым Цімохам рабоча-сялянская вызваліцельная Чырвоная Армія выстраілася ў парад. Каб ён не быў такі стары і замучаны, ён падумаў-бы, што гэта ён, стары Цімох, прымае парад Чырвонай Арміі, што ў сапраўднасці так было.

— Ідзі і забяры сваю кароўку,—зноў звярнуўся да яго камандзір, ужо седзячы на кані.—Шмат хто з сялян забіраюць там свае кароўкі.

Стары Цімох пайшоў па кароўку. Праз хвілін пяць ён вярнуўся з кароўкай на гэта самае месца. Чырвоных эскадронаў ужо не было.

Раптам ён падумаў, што навекі паехалі чырвоныя эскадроны. Гэта было шчасце на адну хвіліну. І шчасце наймчалася. І кароўку зноў забяруць. І няма надзеі на лепшае жыццё. Чырвоныя эскадроны зніклі. Гэта быў прадсмяротны сон? Яго зноў агарнула адзінота. Якім быў—такім і астаўся.

Але яму ўздумалася пайсці ў гміну. Там ён аб усім даведаецца. А можа небяспечна туды ісці? Зноў забяруць і кароўку і надзею. Не! Трэба схадзіць!

Ён падышоў да дзвярэй. Яму пачуліся галасы з таго боку дзвярэй. Спачатку ён пачуў голас войта. Стары скалануўся ад страху—голас войта! Потым ён пачуў незнаёмы голас. Урэшце высунулася з вакенца над дзвярмі войтава рука і вывесіла чырвоны сцяг—побач з белым арлом.

— Ну, а белы арол? — запытаў незнаёмы голас.

— Гэта можна зняць,—паслухмяна адказаў войт.

Цімох зірнуў на чырвоны сцяг.

Колер радасці, брацтва і кроўнасці.

Шмат чаго не ведаў Цімох, але гэта ён якраз ведаў—няма адзінокіх пад чырвоным сцягам.

Так, браты. Няма адзінокіх пад чырвоным сцягам.

І ён супакоены пагнаў дамоў кароўку.

З яўрэйскай мовы пераклаў З. Бядуля.

У СОНЕЧНАЙ АРМЕНІІ

(З уражанняў дэлегата юбілейнага пленума Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР)

I. СУСТРЭЧЫ

...Вечарам 13 верасня мы выехалі з Тбілісі ў Ерэван, насустрач прыгожай сонечнай Арменіі, насустрач народу, які захаваў да нашых дзён самую старажытную ў Совецкім Саюзе і матэрыяльную і духоўную культуру, — насустрач слаўным патомкам сасунскіх багатыроў.

Юбілейную ўрачыстасць армянскага народа, святкаваўшага тысячагоддзе свайго вялікага тварэння, мы ўпершыню ўбачылі і адчулі на вакзале ў Ленінакане. Сюды сустракаць дэлегатаў прышлі прадстаўнікі горада і раёна: рабочыя, калгаснікі, інтэлігенцыя. Дэлегатаў акружылі, як самых жаданых гасцей. Пасля кароткага мітынга, мы, усхваляваныя першай шчырай сустрэчай з прадстаўнікамі армянскага народа, рушылі далей да падножжа сівой гары Арарат, якая відаць была нам з вагонаў. Пагода была ясная, і толькі самая верхавіна гары злівалася з рэдкімі светлымі воблакамі, што плылі з Турцыі. Яны ўперліся ў гару і так застывалі на ёй нерухома, як вечныя снягі.

Абапал поезда насустрач нам беглі пладародныя вінаградныя і бавоўняныя плантацыі, часта траляліся пустынныя, усыпаныя дробнымі камянямі, узгоркі і палі. Такі пейзаж з самых разнастайных кантрастаў мы наглядалі потым і ва ўсіх іншых мясцовасцях Арменіі, дзе давялося нам пабыць. Але ўсюды ярка свеціць тут гарачае паўднёвае сонца.

...І вось ён, нарэшце, Ерэван. У сталіцы Арменіі святочны настрой, ды не толькі настрой — у сталіцы вялікае свята. На пляцы каля вакзала, упрыгожаным транспарантамі і высокім манументам сасунскага багатыра Давіда на ўздыбленым кані Джалалі, тысячы народа са сцягамі, кветкамі. Іграюць аркестры. Дэлегаты ледзь прабіраюцца да трыбуны. Многія пазнаюць любімых совецкіх пісьменнікаў па партрэтах; яны праплазяць як мага бліжэй, каб з вока на вока ўбачыць пазнанага пісьменніка. Яны трымаюць нагатове прыгожыя пышныя букеты кветак.

Каля трыбуны я наглядаў за адным хлопчыкам з кветкамі. Хлопчык хваляваўся, шныраючы між дэлегатаў, з дзіцячай шчырасцю заглядаючы кожнаму ў вочы. Я здагадваўся, што хлопчык напэўна хоча падарыць свой букет і не ведае, каго з пісьменнікаў выбраць для свайго падарунка. Відаць, ён хоча знайсці знаёмы твар пісьменніка, выгляд якога быў-бы для яго зусім пераканальным.

Неўзабаве мы ўбачылі, што і ўся сталіца Арменіі выглядае весела і па-святочнаму. На ўсіх дамах вывешаны сцягі. На шырокіх гарадскіх пляцах натоўпы людзей слухаюць народных танцораў, музыкаў, спевакоў. У горадзе адбываецца алімпіяда артыстаў з народа, прысвечаная юбілею. На сцяне дома, прылягаючага да шырокага цэнтральнага пляца — велізарнае палатно: бой Давіда з арабскім пärом Мера-Мелікам. Крыху ніжэй і абапал — партрэты Давідаў нашай сучаснасці: Чапаеў на кані, слаўныя героі лётчыкі. Адразу складаецца ўражанне, што ўвесь горад прымае ўдзел у нашым пленуме. І гэта ўражанне пацвярджаецца потым ўсё новымі і новымі фактамі.

Нам давялося пабыць у гасцях у калгаснікаў с.-г. арцелі «Бязбожнік». Мы ўбачылі, як вольна, заможна, шчасліва жывуць патомкі сасунскіх багатыроў. Мы ўбачылі квітнеючыя вінаградныя палі, з якіх калгас у мінулым годзе меў тры мільёны рублёў прыбытку. Мы ўбачылі тут гасціннасць працоўнага армянскага народа і яго радасць у дні свайго свята.

II. НА ПЛЕНУМЕ

На пленум прыехалі прадстаўнікі 30 літаратур народаў Совецкага Саюза. Тут былі майстры слова, чые імёны вядомы самым шырокім кругам чытачоў многанацыянальнага Совецкага Саюза. Тут былі і народныя песняры-сказіцелі. Усе яны разам з прадстаўнікамі працоўных Арменіі, разам з армянскімі дзеячамі літаратуры, навукі і друку сабраліся ў прасторную залу тэатра імя Сундукяна на свята тысячагоддзя вялікага армянскага эпаса. Гэта быў пленум культуры, пленум сталінскай дружбы пісьменнікаў, літаратур і ўсіх народаў Совецкага Саюза. Упамінанне імя арганізатара гэтай дружбы, імя вялікага бацькі народаў, генія чалавецтва таварыша Сталіна кожны раз сустракалася доўга не змаўкаючымі апладысментамі і воклічамі «ура».

З яркімі навуковымі дакладамі і гарачымі прывітаннямі выступілі на пленуме тт. Фадзееў, Аразі, акадэмік Орбелі, Купала, Тычына, Самед Вургун, Шалва Дадзіані, Всевалад Іваноў, праф. Кірпоцін і рад іншых пісьменнікаў і дзеячоў культуры, а таксама прадстаўнікі партыі і ўрада Армянскай ССР. І зусім не дзіўна было, што кожны прамоўца, асабліва з пісьменнікаў брацкіх рэспублік, ведае гераічны армянскі эпас бадай не горш за тых дзеячоў армянскай культуры, якія гадамі працавалі над яго збіраннем і ўпарадкаваннем. Адчувалася, што кожны з іх падзяляе радасць армянскага народа, як сваю ўласную, як радасць і свайго народа, прадстаўніком якога ён з'яўляецца.

Эпас «Давід Сасунскі» ужо стаў здабыткам культуры ўсіх народаў Совецкага Саюза. Рускія, украінскія і грузінскія пісьменнікі поўнасцю пераклалі гэты твор і прывезлі падарунак пленуму—гатовыя выданні перакладаў.

Многія прамоўцы зусім слушна падкрэслівалі непарыўную сувязь благародных сасунскіх багатыроў, барацьбітоў за вызваленне і за шчасце свайго народа з багатырамі нашай сучаснасці, з народамі Совецкага Саюза, з нашай слаўнай Чырвонай Арміяй, якая, змятаючы на сваім шляху ўсіх ворагаў, нясе свабоду і шчасце народам Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі.

***

17 верасня мы позна вярнуліся з экскурсіі. Цэлы дзень правялі ў дарозе, аглядалі старажытныя помнікі культуры армянскага народа: цэрквы Гехарта, высечаныя ў скале ў VII-X вяках, развалiны рымскай крэпасці ў Гарні, пабудаванай у першым стагоддзі. Велізарныя, гладка адшліфаваныя пліты і калоны здзіўлялі нас сваёй манументальнасцю, веліччу і строгасцю. Мы ўспаміналі тут сасунскіх багатыроў, якія збудавалі з такіх каменняў сваю крэпасць Сасун.

Нажаль, мы не чулі прамовы тав. Молатава па радыё. Але кожны з нас даведаўся аб ёй, не паспеўшы пераступіць парог гасцініцы «Севан». Таварышы, якія прыехалі раней, ужо сустракалі нас з гэтай радаснай весткай. Асабліва віталі дэлегатаў Беларусі і Украіны. Мы павінны былі тут-жа падрабязна расказваць таварышам з далёкіх ад нас рэспублік пра Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну: колькі там насельніцтва, якія гарады і г. д., і г. д. І ніхто з нас не сумняваўся, што наша слаўная Чырвоная Армія з гонарам выканае сваю баявую задачу. У той-жа вечар пленум ператварыўся ў хвалюючы мітынг, на якім нашы таварышы выказалі свае словы ўдзячнасці і любві к совецкаму ўраду і яго кіраўнікам за мудрае і справядлівае рашэнне.

Усе астатнія дні мы з нецярплівасцю чакалі новых вестак з фронта. Не раз даводзілася бачыць слёзы радасці на вачах у пісьменнікаў, калі яны чыталі карэспандэнцыі аб ліkаванні вызваленых народаў Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Усе мы шчыра зайздросцілі тым, хто вызваляў народы Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, хто сам бачыў і перажыў такія незабыўныя ў жыцці сустрэчы. Нам, беларускім дэлегатам, хацелася хутчэй у Мінск, нам здавалася, што там, дома, на радзіме, мы бліжэй будзем да гэтых грандыёзных падзей.

21 верасня частка дэлегацыі выехала ў Кіеў і Маскву. З першай партыяй дэлегатаў выехалі і мы.

А. ЯКІМОВІЧ.



Беларускі мастак В. В. Алтуф'еў — галоўны мастак павільёна БССР, узнагароджаны разам з іншымі выдатнымі арганізатарамі, будаўнікамі і афарміцелямі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ордэнам «Знак почета».

Зараз тав. Алтуф'еў працуе над афармленнем заключнага канцэрта дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Заканчвае работу над серыяй агітацыйных плакатаў аб Сталінскай Канстытуцыі для працоўных Заходняй Беларусі.

Фотахроніка БЕЛТА.

АНАТОЛЬ АСТРЭЙКА

ПРЫМІ ВІТАННЕ!

Я зноў стаю каля ракі.
Шавеліцца на ўзлессі Нёман.
Вакол і луг, і хмызнякі
Мне змалку самага знаёмы.

Вясной не раз на Неманцы
Мы нераты з суседам трэслі.
А ў восень гнуткія дубцы
На новыя кашолкі неслі.

Збіралі ў лесе жалуды,
Пяклі на палках сыраежкі...
Знаёма ўсё: і ўсплёск вады,
І кладкі, і крывыя сцежкі.

Быў рум калісьці ля ракі.
І ўдзень і ўночы плытагоны
Сасны стрыжнёвай круглякі
Ля берага вязалі ў згоны.

Ішлі плыты ў далёкі шлях
Праз Стоўбцы нашыя на Гродна,
Шумела спелая зямля
Майго вялікага народа.

І песні родныя плылі
Вакол і весела, і ўзнята.
Ля рэчкі—жытнія палі,
А між палёў — старыя хаты.

Сасна стрыжнёвая, як звон
Мінала лес, мінала горы.
І не адзін мы з бацькам згон
Вялі па Нёмнавым прасторы.

Гады прайшлі, як доўгі плыт.
І дваццать год чужыя ногі
Таптaлі родныя палі
І нішчылі на ўсход дарогі.

Не гнаў аж дваццаць вёслаў я
Плытоў па Нёмане вясёлым.
Я плакаў па табе, зямля,
Па гарадах тваіх, па сёлах.

І мара здзейснена мая.
Прымі вітанне, край мой родны.
Хай зоры яснага Крэмля
Гараць над Вільнаю і Гроднам!

ПАШЫРЭННЕ СЕТКІ ВЯСКОВЫХ БІБЛІЯТЭК

Мастацкая, палітычная і сельскагаспадарчая літаратура даўно ўжо заваявала значнае месца ў быту калгаснай сям'і. У нашай калгаснай вёсцы зараз рэдка сустранеш чалавека, які не быў-бы абанентам вясковай або калгаснай бібліятэкі. Мала і такіх калгасных сямей, якія не мелі-б сваёй уласнай бібліятэчкі.

Каб задаволіць імкненне калгаснікаў і калгасніц павысіць свой культурны і палітычны ўзровень, пазнаёміцца са скарбніцамі класічнай і совецкай літаратуры, Наркамасветы БССР штогод павялічвае сетку вясковых бібліятэк пры сельсоветах. Калі ў 1937 годзе пры сельсоветах было ўсяго 64 бібліятэкі, дык зараз іх налічваецца 278, а ў будучым годзе лік іх дасягне 350.

Штогод кожнай вясковай бібліятэцы Наркамасветы БССР асігноўвае 7 тыс. рублёў на літаратуру. Штогод вясковая бібліятэка атрымлівае ў сярэднім 1200 новых кніг. Толькі за 1939 год кніжны фонд вясковых бібліятэк павялічыцца з 240 тысяч да 570 тысяч, г. зн. на 330 тысяч кніг. Лічбы гэтыя гавораць самі за сябе.

Рост сеткі вясковых бібліятэк не дае яшчэ поўнага ўяўлення аб пранікненні кнігі ў калгасную вёску. Апрача вясковых бібліятэк калгаснікаў абслугоўвалі ў 1938 годзе 1249 бібліятэк пры хатах-чытальнях з фондам у 562 тысячы кніг і 1600 калгасных бібліятэк з фондам у 284 тысячы кніг. У бягучым годзе гэтыя кніжныя фонды таксама значна павялічыліся.

Пашырэнне сеткі калгасных бібліятэк— яркі паказальнік культурнага росту калгаснай вёскі ў Совецкай Беларусі.

ШКОЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА Ў БССР

У пачатку навучальнага года Совецкая Беларусь узбагацілася 45 новымі школамі. Каля 8500 дзяцей перабраліся ў светлыя прасторныя класы.

Новыя школы ў БССР будуюцца бесперапынна. Штогод у гарадах і вёсках Совецкай Беларусі ўводзяцца ў строй дзесяткі новых школ. У 1938 годзе было пабудавана 27 гарадскіх школ і 34 вясковых на 18.640 вучняў. У 1939 годзе, апрача ўжо адкрытых 45 школ, да канца года будзе закончана будаўніцтва яшчэ 46 школ на 15.540 дзяцей.

На 1940 год вызначана будаўніцтва 13 гарадскіх і 54 вясковых школ на 19.500 дзяцей.

Цікава прывесці некаторыя параўнальныя даныя: у 1914-15 навуч. годзе на тэрыторыі цяперашняй Совецкай Беларусі было 4.093 пачатковых школ, 77 няпоўных сярэдніх і 51 сярэдняя. А ў 1938-39 навучальным годзе налічваецца 5.036 пачатковых школ, 1426 няпоўных сярэдніх і 603 сярэднія школы. Яшчэ большы кантраст даюць лічбы вучняў: у 1914-15 годзе навучалася 264.300 дзяцей, а ў бягучым навучальным годзе 1.067.900 дзяцей.

Вялікія дасягненні ў будаўніцтве тэхнікумаў і вышэйшых навучальных устаноў. У 1914-15 годзе ў Беларусі было ўсяго 11 тэхнікумаў з 798 студэнтамі. Не было ніводнага ВУЗ'а. А ў бягучым годзе ў БССР функцыяніруюць 101 тэхнікум з 36.212 студэнтамі і 23 ВУЗ'ы з 16.862 студэнтамі.

Такія пераканальныя лічбы росту школьнай сеткі і навучальных устаноў Совецкай Беларусі.

АД РЭДАКЦЫІ

У сувязі са змяшчэннем у «Літаратуры і мастацтва» ад 12 верасня бягучага года артыкула пастаноўшчыка спектакля «Брат героя» у Тэатры юнага гледача тав. Ерухімовіча, мастак тэатра тав. А. І. Данцова просіць унесці папраўку, што ніякага ўдзелу ў афармленні гэтага спектакля яна не прымала.



П'еса Н. Пагодзіна «Пазь сярэбраная» ў пастаноўцы Белдзяржрамтэатра. Сцэна з заключнага акта п'есы. Злева направа артысты: Пекур, Браварская, Аляксеенка, Яцоўскі, Рамановіч.



П'еса Кандрата Крапівы «Партызаны» ў Беларускім Дзяржаўным драматычным тэатры. **На здымку:** дзед Бадыль (арт. Бараноўскі) расказвае камандзіру дывізіі Чырвонай Арміі (арт. Саннікаў — справа) і камісару (арт. Краўцоў), як бліжэйшым шляхам, праз лес, зайсці ў тыл белапалякам.

М. ЮДЭЛЕВІЧ

РОСКВІТ БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ

Ніколі драматургічны жанр не займаў такога значнага месца ў беларускай совецкай літаратуры, як за апошнія некалькі год. Амаль усе нашы пісьменнікі сталі прабаваць свае сілы ў галіне драмы: Колас, Бядуля, Чорны, Крапіва, Самуйлёнак, Глебка, Броўка (оперныя лібрэта), Клімковіч, Шынклер, Вольскі, Маўр, Аксельрод, Каган, Левін, Ушакоў, Жаўрук, Шапавалаў, а зараз працуюць над п'есамі і опернымі лібрэта Якімовіч, Агняцвет, Куляшоў, Блесінаў, Мальцінскі, Платнер і інш. Калі дадаць да іх, так сказаць, драматургаў па спецыяльнасці—Рамановіча, Гурскага, Ільінскага,—дык атрымліваецца вельмі салідная армія.

Думаю, што такая вялікая цікавасць пісьменнікаў да драмы невыпадковая з'ява. Яна з'яўляецца вынікам росту нашага тэатральнага мастацтва з аднаго боку, росту і пашырэння кругазора нашых пісьменнікаў — з другога.

Яшчэ некалькі год назад было зусім інакш. Паміж літаратурай і драматургіяй быў вялікі водараздзел. Для тэатра пісалі спецыяльныя людзі, якія манапольна валодалі так званай спецыфікай драматургіі. Спецыфіка гэта, асаблівасць драматургіі як жанра, многімі разумелася, як абасобленасць ад агульных патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да мастацкай літаратуры. У драматургіі, маўляў, важна добра скроіць сюжэт, а яркая мова, паэзія, праўдзівасць чалавечых перажыванняў—гэта не так абавязкова ў тэатры, гэта справа літаратуры... Драматургія, па сутнасці, калі не лічыць некалькіх удалых п'ес сапраўдных драматургаў, станавілася па-за літаратурай, ператваралася ў драмаробства. Асабліва пасўсіявала ў драмаробстве група нацыянал-фашыстаў, якія запладзілі тэатры сваімі халтурнымі п'ескамі.

Калі беларуская совецкая літаратура была ачышчана ад гэтых ілжэ-пісьменнікаў, а рэпертуар тэатраў ад іх «творчасці», перад актывам ССПБ паўстала задача—стварыць поўнакаштоўны рэпертуар для тэатраў БССР, задаволіць па-сапраўднаму тыя патрабаванні, з якімі глядач прыходзіць у тэатр. А патрабаванні гэтыя ўзрасталі з кожным днём. Тады ў тэатр пашлі старэйшыя паэты і празаікі—Колас і Бядуля, Чорны і Крапіва. За імі паследавалі і другія. Былі створаны п'есы: «У пушчах Палесся» Я. Коласа, «Салавей» З. Бядулі, «Банькаўшчына» К. Чорнага, «Партызаны» К. Крапівы.

...Своеасаблівая драматургія гэтага перыяда! Ва ўсіх гэтых п'есах, напісаных рознымі аўтарамі, ёсць ярка выражаныя агульныя рысы. Гэта амаль заўсёды інсцэніроўкі раманаў — «У пушчах Палесся», «Салавей», «Банькаўшчына», «Сяржант Дроб». Гэтыя п'есы пачалі новы этап у развіцці беларускай совецкай драматургіі. Іх стварылі новыя ў драматургіі людзі. Першым словам хочацца выказаць самае важнае. Адсюль тэматыка п'ес. Ніхто не піша, скажам, бытавой камедыі ці п'есы на «любоўную тэму» і г. д. Адчуванне важнасці, адказнасці стварэння новай вялікай драматургіі вызначае высокі ідэйны ўзровень тэматыкі п'ес. Усе пішуць вялікія сацыяльныя драмы, з вялікім ахопам гістарычных падзей, галоўным чынам імперыялістычнай і грамадзянскай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Новыя драматургі яшчэ мала асвоіліся з спецыфікай жанра. Адсюль схільнасць да інсцэніроўкі сваіх раманаў, як пераходнай ступені ад прозы да драмы. Адсюль-жа значныя недахопы фармальнага парадку ў гэтых п'есах.

Аб недахопах гэтых пісалася і гаварылася не раз. І здаецца мне, за гэтымі размовамі часта пераставалі заўважаць вялікія вартасці гэтых першых драматургічных твораў. П'есы «Салавей», «У пушчах Палесся», «Партызаны» да гэтага часу не сыходзяць са сцэны нашых тэатраў, да гэтага часу яны горача хвалююць і выхоўваюць гледача. Гэта лепшы доказ мастацкай сілы гэтых твораў. П'еса «Салавей» сведчыць, што драматургія — не выпадковасць у багатай і разнастайнай жанрамі творчасці З. Бядулі. Бядуля—драматург, і моцны драматург, які ўмее будаваць вострую і напружаную сітуацыю, умее ў мове героя выявіць яго характарыстыку; ён павінен пісаць п'есы, захапляючыя і хвалюючыя п'есы.

Нельга недаацэньваць сілы драматурга Я. Коласа. Я маю на ўвазе не толькі «У пушчах Палесся», але і Вайну» з цудоўным першым актам і сцэнай у палі войскага ў другім акце.

Хто бачыў «Банькаўшчыну» К. Чорнага, той назаўсёды запомніў Леапольда Гушку, Паўлу Неміру, большавіка Евеля Цывіна. Выдатным майстрам псіхалагічнай драмы паказаў сябе К. Чорны ў гэтай п'есе.

Аб «Партызанах» Крапівы шмат пісалася. Дастаткова адной сцэны ў Рыгоравай хаце, каб бачыць вялікі драматургічны талент Крапівы, які ўвесь час развіваецца.

Наколькі сур'ёзны быў новы ўздым беларускай драматургіі, які вызначыўся названымі п'есамі, паказвае далейшы бурны рост беларускай совецкай драматургіі. Услед за з'яўленнем цікавай п'есы М. Клімковіча «Кацярына Жарнасек» — таксама першага вопыта драматурга (і аб гэтай п'есе можна сказаць усё тое, што сказана было вышэй аб п'есах 1937 года)— з'яўляюцца такія п'есы, як «Пагібель воўка» Самуйлёнка, «Хто смяецца апошнім» Крапівы і «Над Бярозай-ракой» Глебкі, якія выводзяць, на мой погляд, беларускую драматургію на ўсесаюзную арэну. Калі тыя п'есы можна аднесці да перыяда вучнёўства беларускай драматургіі, дык гэтыя можна аднесці да перыяду спеласці. Не ведаю, ці вывучаў Самуйлёнак сцэну, можа гэта ў яго стыхійнае пачуццё сцэнічнасці, але развіта яна ў яго цудоўна. Быў-бы жывы Э. Самуйлёнак, з яго вышаў-бы вялікі драматург. Такія сцэны, як сцэна Харкевіча з дочкай сваёй Насцяй—вялікая рэдкасць пакуль ва ўсёй совецкай драматургіі. Гэта ўзор драматургічнага раскрыцця вобраза, нідзе ва ўсёй п'есе мацней не выкрыта нутро панскага халуя, воўка, які хаваецца пад авечай шкурай, нідзе пераканальней не знішчан Харкевіч, чым у гэтай невялікай сцэне з дачкой яго Насцяй, якая шчыра верыла, што ён чырвоны партызан і пачынае здагадвацца аб страшэннай праўдзе. Не будзем гаварыць аб цудоўнай трапнасці і жыццёвасці, з якой паказаны Абабурка, наэт Шышка. Вельмі важная якасць п'есы Самуйлёнка — вялікая грамадзянская ўсхваляванасць аўтара, якая пранізвае п'есу наскрозь. І ў вобразе Мірона і Язэпа мы чуем усхваляваны, страсны голас аўтара, які жадае сваёй п'есай дапамагчы асэнсаваць кожнаму вялікі змест нашага совецкага жыцця, кліча да таго, каб мацаваць і аберагаць ад ворагаў яго.

Часта, калі меркавалі аб прычынах няўдачы станоўчых вобразаў у большасці совецкіх п'ес, хацелася прыгадаць мудрыя словы з арыстотэлеўскай паэтыкі: хвалюе той, хто сам хвалюецца, і выклікае гнеў той, хто сам гнеўны. Самуйлёнак сам хвалюецца, таму ён хвалюе, таму так абаяльны, так даходлівы да сэрца гледача так званыя станоўчыя вобразы п'есы, якія-б не былі недахопы ў іх абмалёўцы.

Крапіва як драматург расце наглядна ад п'есы да п'есы. Першая—«Канец дружбы»—была п'еса з тыповымі для драматургіі тых год недахопамі — раней зададзены ідэйны тэзіс, які ілюструецца сцэнічнымі падзеямі, анёльска-чысценькі станоўчы герой, які для «ажыўлення» надзяляецца «чалавечымі» рысамі, адарванымі ад яго «вытворчых функцый», і вымазаны ў сажу адмоўны герой і т. д. Але і тады скрозь агульнапрынятую схему прарываўся жывы струмень творчасці Крапівы. Такая была сцэна ў вёсцы, пралог, ды і ў абмалёўцы Карнейчыка было многа жывога і моцнага. Другая п'еса—«Партызаны»—ясна паказала, што схематызм і надуманасць першай п'есы неўласцівы Крапіву, як драматургу. Поўная натуральнасць інтанацыі п'есы, прастата, праўдзівасць і ў той-жа час мастацкая эканомнасць у паказе падзей характарызуюць «Партызан». Гэта сапраўдны драматургічны дакумент аб гераічным 1920 годзе. Мы ўпаміналі ўжо аб драматургічным майстэрстве шостай сцэны п'есы—ў хаце Рыгора, калі драматургу ўдаецца хістанні селяніна-бедняка паміж здрадніцтвам дзеля асабістага шчасця і пачуццём класавага доўга перадаць у прадзельна нагляднай і вострай драматычнай форме. Уся глядзельная зала перажывае разам з Рыгорам, і перамога Рыгора— перамога гледача. Гэта хвалюе і гэта выхоўвае. Шмат яшчэ падобных сцэн у п'есе. Але разам з тым востра адчуваецца буйнейшы драматургічны недахоп «Партызан»—няма сапраўднага драматургічнага сцержня, сцэны не з'яўляюцца неабходнымі звеннямі строга прадуманай лініі развіцця п'есы ў цэлым, як гэта павінна быць у драматургіі. Гэта ёсць ужо ў трэцяй п'есе Крапівы. Камедыя «Хто смяецца апошнім» пабудавана так, што крок за крокам раскрывае замысел аўтара. Яна напісана з сапраўдным драматургічным майстэрствам. П'еса, якая выкрывае падхалімаў і палітычных прахадзімцаў, напісана з усім бляскам таланта Крапівы — сатырыка.

П'еса Глебкі «Над Бярозай-ракой» — вялікая вершаваная гістарычная эпапея аб барацьбе Чырвонай Арміі і партызан супроць белапольскіх акупантаў. Упершыню беларускі драматург узяўся за паказ правадыроў нашай партыі. Вобраз Серго Орджанікідзе ў п'есе «Над Бярозай-ракой» вялікая ўдача Глебкі і ўсёй беларускай драматургіі. Не хочацца зараз падрабязна гаварыць аб п'есе, паколькі праца над ёй у тэатры (Віцебскі БДТ) яшчэ далёка не закончана і п'еса яшчэ не прыняла свае канчатковыя сцэнічныя формы. Можна толькі сказаць, што гэта сапраўдная ўдача нашай драматургіі, арыгінальны і моцны твор.

Нельга тут не ўпамянуць, што наша драматургія справілася яшчэ з адной адказнай і новай для яе задачай: стварэннем лібрэта для беларускіх опер. Чатыры лібрэта напісаны тт Броўкам, Рамановічам, Клімковічам, а таксама Глебкам і Броўкам («Кветка шчасця»).

Асобна хочацца адзначыць лібрэта Броўкі. Ён першы кінуўся ў гэта незнаёмае плаванне і таму яму так многа прышлося перапрацоўваць тэкст лібрэта, але паэт з гонарам вышаў з гэтага выпрабавання. Лібрэта ў яго цяперашнім выглядзе мае вялікія дадатныя якасці.

***

Мы спыніліся тут самым беглым чынам на некалькіх п'есах і не назвалі яшчэ многіх добрых п'ес. Але і сказанага дастаткова, каб зрабіць вывад: беларуская драматургія знаходзіцца ў росквіце, ствараецца драматургія вялікага ідэйнага сэнсу, жыццёвая, яркая, драматургія, якая выходзіць за рамкі нашай рэспублікі. Мы ўпэўнены, што на прадстаячай дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве названыя п'есы сустрэнуць высокую ацэнку маскоўскага гледача.

Што хочацца адзначыць у гэтых беглых нататках аб характары развіцця нашай драматургіі? Усё-ж яшчэ аднастайна тэматыка. Большасць п'ес—аб грамадзянскай вайне, аб барацьбе з ворагамі народа. Шмат важнейшых тэм не ўзнята. І яшчэ адна асаблівасць. Сюжэты п'ес вельмі агульныя, у іх мала прыватнага, індывідуальнага, мала асабістага—ад драматурга. Між тым, чым нечаканей, індывідуальней сюжэт, тым ярчэй можна ў ім раскрыць агульную ідэю. У нас драматургі адштурхоўваюцца больш ад агульнага: імперыялістычная вайна, акупацыя, і ўжо на фоне гэтага знаходзяць месца для сваіх герояў. А цікава было-б асаблівы «прыватны» лёс паказаць і праз жыццё людзей, паказаць гістарычныя падзеі. Напрыклад, надзвычай ярка абмалёвана імперыялістычная вайна праз лёс і ўзаемаадносіны людзей у першых актах «Банькаўшчыны». А ў апошніх актах паказаны самі падзеі рэвалюцыі і ў гэтых падзеях аўтар шукае месца для сваіх герояў. І часта не знаходзіць...)

Рад новых работ драматургаў адрозніваецца свежасцю тэматыкі і жанра (Вольскі — добрая казка для ТЮГ'а на матэрыяле народных казак, Маўр — п'еса, якая паказвае рост калгасніцы-стаханаўкі і высмейвае мяшчанства, Ушакоў і Жаўрук — музычная камедыя на сучасным калгасным матэрыяле).

Аднак, гэта далёка недастаткова. Асабліва павінны пашырацца тэматычныя далягляды нашай драматургіі зараз, калі доблесная Чырвоная Армія вызваліла заходніх беларусаў і заходніх украінцаў ад прыгнёту польскіх паноў, дадала нашым тэатрам яшчэ мільёны гледачоў. Запатрабаванні гэтых новых гледачоў трэба чула ўлічыць нашым драматургам. Мы павінны ствараць добрыя п'есы, якія-б раскрылі ім сэнс нашай цудоўнай совецкай рэчаіснасці.

З многіх пытанняў, якія паўстаюць, калі думаеш аб развіцці нашай драматургіі, хочацца тут выдзеліць яшчэ адно. З лёгкай рукі вульгарызатараў устанавілася ганенне на героя ў драме. Яго, маўляў, павінна замяніць маса. Невыпадкова-ж атрымалася, што ў «Салаўі» няма Салаўя, як героя п'есы, тэатр адцясніў яго на задні план «палітруком» пры ім Язэпам. У «Кацярыне Жарнасек» няма гераіні п'есы — Кацярыны. Таксама ў лібрэта Броўкі клопат аб «палітруку» прывёў да таго, што функцыі героя раздваіліся паміж Міхасём і большавіком Анішчуком, ад чаго ні аднаго героя—цэнтральнага вобраза — не атрымалася і назва зноў-такі аказалася неапраўданай.

Сапраўднае мастацтва — у вялікім абагульненні. Прыгадаем словы М. Горкага, што нашы героі складаней і цікавей, «чым усе Дон-Кіхоты і Фаўсты мінулага». «Іменна такім, — піша далей А. М. Горкі ў артыкуле «Аб п'есах», — павінен бачыць яго драматург для таго, каб дапамагчы яму адчуць такім-жа сябе. Наша мастацтва павінна стаць вышэй рэчаіснасці і ўзняць чалавека над ёю, не адрываючы яго ад яе».

Няхай гэтыя словы вялікага пісьменніка натхняць нашых драматургаў на стварэнне гераічных, бачымых на далёкую адлегласць, праз многія пакаленні гледачоў, вобразаў, каб данесці да нашых патомкаў праўду аб велічы, прыгожасці і гераізме нашых дзён.

Нам. адказнага рэдактара Я. ГЕРЦОВІЧ.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-391. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № Г—1482